www.nv-online.info

№ 35 (4184)

5 мая 2017 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ!

Не ў аўторак, а ў сераду

Шаноўныя прыхільнікі "Народнай Волі"! Зноў мяняецца графік выхаду газеты. На гэты раз у сувязі з Днём Перамогі – 9 Мая. Наступны нумар "Народнай Волі" Вы атрымаеце не ў аўторак, а ў сераду, 10 мая. Далей усё пойдзе па графіку.

Рэдакцыя газеты "Народная Воля".

1941 - 1945



Іх перамога!

Шкада, што з тых, хто за яе змагаўся ў той жудаснай вайне, далёка не ўсе дажылі да сённяшніх дзён. Схілім галовы перад мужнымі абаронцамі Айчыны!

СКАЗАНА!

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

– «Вялікі камень» з'яўляецца прыкладам таго, як Кітай перакройвае эканамічную карту свету.

Ён прыходзіць, у прыватнасці, у Беларусь, мы з ім ствараем тут вялікую індустрыяльную пляцоўку, і следам сюды прыходзяць самыя перадавыя кампаніі планеты, перш за ўсё Кітайскай Народнай Рэспублікі. Калі пралічваліся вынікі «Вялікага каменя», мы лічылі, што Беларусь толькі ад экспарту прадукцыі з гэтага парку атрымае прыток валюты каля 50 млрд долараў.

(4 мая падчас сустрэчы з прадстаўнікамі кітайскіх СМІ – удзельнікамі прэс-тура ў Беларусь.)



УЧОРА

МЗС выказала паслу Францыі рашучы пратэст

Пасол Францыі **Дзідзье Канес** 4 мая быў выкліканы ў Міністэрства замежных спраў Беларусі ў сувязі з інцыдэнтам з беларускай зборнай па хакеі, паведаміла прэс-служба МЗС. У ходзе сустрэчы намеснік міністра замежных спраў **Алег Краўчанка** выказаў "рашучы пратэст беларускага боку ў сувязі з праведзеным у форме, што прыніжае чалавечую годнасць", наглядам беларускіх спартсменаў, якія ўдзельнічаюць у чэмпіянаце свету па хакеі з шайбай, прадстаўнікамі праваахоўных органаў Францыі 3 мая на чыгуначным вакзале Парыж-Манпарнас.

Беларусь патрабуе правесці расследаванне гэтага інцыдэнту, даць тлумачэнні, выказаць прабачэнні, а таксама прыняць усе неабходныя меры для недапушчэння такіх інцыдэнтаў у будучыні, гаворыцца ў паведамленні.

Міністэрства замежных спраў Беларусі запытала тлумачэнні ў французскага боку ў сувязі з вобыскам хакейнай зборнай у Парыжы.

Спартсмены прыбылі ў Парыж з Бардо, дзе 30 красавіка і 1 мая праводзілі спарынгі з французамі, якія разам з немцамі з'яўляюцца гаспадарамі 81-га чэмпіянату свету па хакеі, што стартуе сёння, 5 мая. На выхадзе з цягніка быў дагледжаны багаж трох трэнераў (Дэйва Льюіса, Крэйга Вудкрафта і Алега Антоненкі), двух ігракоў (Ягора Шаранговіча і Андрэя Касціцына), а таксама ўрача. Нічога забароненага знойдзена не было.

ПАМЯЦЬ

«Званка з Кіева чакаем кожны дзень»

Званне Героя Украіны беларусу Міхаілу Жызнеўскаму можа быць нададзена ўжо ў бліжэйшы час.

Як паведамляла раней «Народная Воля», Вярхоўная Рада Украіны падтрымала ініцыятыву аб прысваенні вышэйшай узнагароды краіны замежнікам, якія адстойвалі прынцыпы дэмакратыі і правоў чалавека падчас Рэвалюцыі Годнасці.

Беларус Міхаіл Жызнеўскі загінуў 22 студзеня 2014 года на вуліцы Грушэўскага ў Кіеве. У лістападзе Жызнеўскі быў узнагароджаны ордэнам Герояў Нябеснай Сотні, які прэзідэнт Украіны ўручыў яго бацькам.

– *Чакаем навін з Кіева кожны дзень,* – сказала «Народнай Волі» маці загінуўшага беларуса Ніна Жызнеўская. – *Трэба класціся ў бальніцу, але не кладуся: а раптам патэлефануюць і скажуць прыязджаць?..*

Міхаіл Жызнеўскі пахаваны пад Гомелем. Некалькі разоў яго магілу апаганьвалі вандалы: зрывалі беларуска-украінскую сімволіку, пашкодзілі помнік. Прысваенне звання Героя Украіны, лічаць бацькі Жызнеўскага, змагло б абараніць магілу іх сына.

Раман ВАСІЛЬЕЎ.

НАДВОР'Е

На 9 Мая зноў холадна

Сёння ў Беларусі чакаецца +12…+18°С, у паўднёвых раёнах да +22°С, паведамілі сіноптыкі. Цёпла будзе і ў суботу: днём +14…+21°С, па поўдні краіны паветра прагрэецца да +23°С.

Але цяпло пратрымаецца нядоўга. Днём у нядзелю надвор'е пачне мяняцца. Праўда, яшчэ будзе не холадна, па поўдні краіны ўвогуле дзённыя максімумы тэмпературы дасягнуць +17…+22°С.

Аднак 8 мая чакаецца няўстойлівае халоднае надвор'е. Тэмпература паветра ўначы складзе +1…+8°С, па поўначы пры праясненнях паветра астудзіцца да 0…-2°С. Днём будзе +7…+14°С.

9 мая на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу тэмпература можа панізіцца да 0…-3°С. Днём будзе ўсяго +2…+9°С.

Падпісацца на «Народную Волю» можна ў любы дзень у любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».

РАЗБОР ПОЛЕТОВ

Александр БУХВОСТОВ:
«На МАЗе и Тракторном заводе я не был очень давно…»

Казалось бы, 1 Мая, в День солидарности трудящихся, рабочий класс должен был заявить о своих проблемах. Но, судя по фото и телекадрам, тех, кто стоит у станков, на конвейере, не видно было на митингах. Что, их всё устраивает?

Этот вопрос «Народная Воля» обсудила с профсоюзным лидером **Александром БУХВОСТОВЫМ.**

– Не созрел еще рабочий класс для активного выражения своих требований, – говорит Александр Иванович. – Сегодня на предприятиях очень жестко поставлен контроль за тем, чтобы люди не участвовали ни в каких массовых мероприятиях, кроме тех, которые проводятся под эгидой власти.

Безусловно, на любом предприятии есть люди, которые готовы выйти на площадь и заявить о своей позиции, но пока они тоже взвешивают все «за» и «против». Сегодня они выйдут, а завтра их уволят с работы. И что дальше?..

На крупных предприятиях сегодня стараются поддерживать более-менее здоровый микроклимат: вовремя платят зарплату, обещают повышения, премии дают. И я скажу, что зарплата на МАЗе, на МТЗ, других машиностроительных предприятиях сегодня еще более-менее. Шиковать не будешь, но проживешь. Конечно, я не сравниваю с шахтерами, у которых заработная плата переваливает за тысячу долларов и более.

Одним словом, на большинстве предприятий сегодня нет взрывоопасной ситуации, которая может спровоцировать массовые волнения рабочих, как это было, например, в 1991 году, когда резко отпустили цены, и тогда все были недовольны властью – и директора, и рабочие.

– Получается, и на заявленный Белорусским конгрессом демократических профсоюзов Марш солидарности люди не пришли бы?

– Мы хотели провести Марш солидарности, но его, вы знаете, запретили. И мы решили, что раз не позволили провести акцию в нашем формате, то не будем проводить ее вообще.

– Александр Иванович, а как вы оцениваете митинг, который провели 1 Мая официальные профсоюзы?

– Если мы 1 Мая отмечаем День солидарности трудящихся, то ФПБ обычно устраивает акцию в формате праздника труда. Акция прошла как обычно, без особенностей. Тут даже нечего комментировать.

– А вы никогда не рассматривали формат проведения совместной с ФПБ акции?

– Я в этом смысле очень компромиссный товарищ. И считаю, что нужно использовать любую возможность, чтобы добиться влияния на людей. И верхушка официальных профсоюзов – это не члены профсоюзов. У независимых профсоюзов сегодня нет достаточного доступа на предприятия, мы поставлены в такие условия, что утрачиваем возможность работать с людьми.

– Некоторые любят задавать лидерам независимых профсоюзов вопросы с перчиком: когда вы в последний раз были в цеху на предприятии, в шахту спускались и общались с людьми?

– На производствах сейчас собрания собираются очень редко. Раньше профсоюзные лидеры без проблем могли пройти в цех и встретиться с рабочими. А сейчас даже официальные профсоюзы стараются не собирать людей на производстве, так что такие встречи бывают крайне редко.

Что касается лично меня, то я давно не был на МАЗе, на МТЗ. Зато у проходных бываю регулярно. Такой возможности встречаться с людьми нас пока не лишили. Одним словом, делаем что можем.

А если говорить о шахтах, то на «Беларуськалии» независимый профсоюз горняков достаточно сильный. И они работают на равных с ФПБ: участвуют в переговорах, заключают коллективные договоры, встречаются с людьми.

Поэтому критика, конечно, справедливая, но надо учитывать и наши возможности.

Некоторые считают, что на предприятия нужно прорываться чуть ли не с боем. Но какой результат от этого, если меня вынесут с предприятия, затем оштрафуют или посадят? Проходили мы все это… Люди на это не отреагируют, вот что печально! Я это знаю совершенно точно. Сегодня многие живут по принципу «сам за себя». И в конфликты с властью стараются не вмешиваться. Руководители официальных профсоюзных комитетов, которые работают на предприятиях, не хотят остро конфликтовать с администрацией предприятий, с властью. Мы готовы конфликтовать и с теми, и с другими, но у нас возможности ограничены. Мы стараемся накапливать силы.

Ксения ГОРСКАЯ.

ЧУЛІ?

Вячаслаў Сіўчык абʼявіў галадоўку

Апазіцыйны палітык Вячаслаў Сіўчык, адзін з лідараў руху салідарнасці "Разам", арыштаваны на 15 сутак за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі, якая прайшла 1 мая ў цэнтры Мінска.

Суддзя Цэнтральнага раёна г.Мінска Міхаіл Хома прызнаў Сіўчыка вінаватым па ч.3 арт.23.34 КаАП (паўторны на працягу года ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве).

Вячаслаў Сіўчык абʼявіў галадоўку, але не ў сувязі з рашэннем суда, а з-за дрэнных умоў утрымання ў ЦІП.

Адміністрацыйны пратакол за ўдзел у акцыі 1 мая ўчора па пошце атрымала і Марына Адамовіч – жонка апазіцыйнага палітыка Мікалая Статкевіча.

БелаПАН.

СТАЛА ВЯДОМА...

Наталля Папкова адбывае арышт у Мінску

Актывістка дэмсіл з Брэста Наталля Папкова, затрыманая 1 мая ў Мінску пасля вулічнай акцыі, адбывае ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў ГУУС Мінгарвыканкама 15 сутак адміністрацыйнага арышту па прыгаворы суда Ленінскага раёна Брэста ад 19 красавіка. За ўдзел у мінскай акцыі яна атрымала штраф.

Як паведамлялася, сувязь з Папковай знікла пасля несанкцыянаванага мітынгу 1 мая. На наступны дзень стала вядома, што актывістку ўтрымліваюць у ЦІП на вул.Акрэсціна. Праваабаронцы высветлілі, што адміністрацыйная справа актывісткі за ўдзел у гэтай акцыі разглядалася 3 мая ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска. Суддзя Вікторыя Шабуня прызнала Папкову вінаватай на падставе артыкула 23.34 КоАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў) і пакарала штрафам у 30 базавых велічынь (690 рублёў).

Адразу пасля затрымання актывістку ўзялі пад арышт. Прысуд аб арышце ёй быў вынесены 19 красавіка суддзёй Ленінскага раёна Брэста Алегам Міранюком па артыкуле 23.4 КоАП (непадпарадкаванне законнаму распараджэнню ці патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёй службовых паўнамоцтваў). Пратакол быў складзены 17 сакавіка непадалёк ад чыгуначнага вакзала Брэста за пераход дарогі па-за пешаходным пераходам, пасля чаго Папкова была затрымана і змешчана ў ІЧУ Брэста.

Актывістка пакінула залу суда, не чакаючы рашэння, і, паводле інфармацыі праваабаронцаў, некаторы час хавалася ад праваахоўнікаў.

Наталля Папкова, актыўная ўдзельніца акцый супраць дэкрэта "аб дармаедах", пачынаючы з сакавіка некалькі разоў прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку каралася адміністрацыйным арыштам. Акрамя таго, яе змяшчалі ў псіханеўралагічны дыспансер з санкцыі пракуратуры ў сувязі з тым, што нехта з суседзяў паведаміў, што яна нібыта спрабавала скончыць жыццё самагубствам.

Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ, БелаПАН.

НЕ ЗАБЫТЬ!

Цена Победы

В лепельском пансионате медицинского цэнтра «ЛОДЭ» существует многолетняя традиция – накануне Дня Победы приглашать на отдых ветеранов и участников войны, узников концлагерей, людей, чье детство опалила война. Понятно, таких людей становится все меньше и меньше. Их приезд – это для обслуживающего персонала не только радость помочь им восстановить силы, но и возможность с огромным интересом выслушать рассказы живых свидетелей истории...

61802

Именно такой номер четырехлетней Фросе выкололи на левой руке в Освенциме 74 года назад, а кажется, что клеймо поставили на сердце – стоит услышать песню военных лет или увидеть кадры кинохроники, как оно сжимается и холодеет, и тогда приходится класть под язык спасительный валидол.

Детская память удивительно цепкая. **Ефросинья Павловна Игнатович** помнит, как в концлагере их разлучили с матерью. Что пережила женщина, у которой в партизанах погиб муж и которую фашисты оторвали от семерых детей, знает только Бог. Она успела сказать старшему Толе: «Береги их, сыночек!» Он, конечно, старался, но после того, как у него брали кровь, брат тихонечко лежал на нарах в бараке, и младшие старались не отходить от него. Страшнее всего мучил голод. Люда и Вера приняли белый порошок, которым густо посыпали пол (фашисты боялись эпидемий и не жалели хлорки), за сахар и умудрились его проглотить. Хлор разъедал кишки, на мучения девочек было невыносимо смотреть, и их тотчас отправили в крематорий. Вскоре от голода и холода умер брат Володя. Фрося ходила за немкой, раздающей баланду, в надежде, что та плеснет немножко в консервную банку, служившую миской, и она отнесет часть супа Толику, но женщина ударила поварешкой по протянутой руке с такой силой, что конечность повисла, как плеть.

– Держи руку ровно, – приказал семилетний Толик, – а то срастется неправильно.

Он нашел тряпку и, как смог, замотал сестре руку. А наутро Фросю перевели в разряд –blutkonserv и взяли на донорскую процедуру. Вот тогда она поняла состояние брата. Казалось, ветер подует – и она упадет. Но каким-то чудом жила. Раз в неделю – «фильтрация». Узников раздевали догола, осматривали и при виде пятен на коже или подозрении на болезнь отправляли в печь или газовую камеру. У них с Толиком были прозрачные белые тела, и это их спасло.

Как-то зимой она проснулась от тишины и холода. Не лаяли овчарки, не раздавались команды. А потом начали стрелять, рваться мины (это фашисты, успев уничтожить две печи крематория, заминировали подходы к концлагерю). 27 января 1945 года бойцы Красной Армии вошли в Аушвиц. Уцелевших детей Клавдии Михайловны Шершневой отправили в детдом в Москву. Там и нашла их чудом выжившая мать. Была она такой худой, с почерневшим лицом, что Фрося ее не узнала – так концлагерь и пережитое изменили ее внешность.

– Не пойду к этой цыганке! – заявила воспитательнице, но, когда мать тихо заплакала и опустилась на стул, сердце девочки дрогнуло. По движениям и повадкам она поняла, что перед ней мама.

Мирная жизнь сложилась для Фроси неплохо. Она окончила среднюю школу в Лепеле, электротехникум связи, вышла замуж за Владимира Ильича Игнатовича, родила и воспитала двух сыновей и дочь,


Ефросинья Павловна Игнатович

дала им образование.

Первое время после освобождения ей хотелось только хлеба. Когда выросла, научилась печь его сама, и все в доме знают, как свято она к нему относится. В День Победы печет сдобный каравай, как на Пасху. Положит на рушник, поцелует и скажет: «Слава Богу, живем с хлебом, и бомбы на голову не падают!»

Юность – время отваги

– Война – это несчастье в увеличенном масштабе, – говорит участница Великой Отечественной войны, партизанка **Надежда Егоровна Кальверш.** – Она превращает в диких зверей людей, рожденных, чтобы жить братьями.


Надежда Егоровна Кальверш

Когда фашисты оккупировали Лепельщину, Наде было 16 лет. Немецкий гарнизон стоял в Кубличах, и оттуда приехали на мотоцикле офицер с переводчиком. Выбрал двух самых красивых девушек и сказал, что они будут работать на немецкой кухне. Если не согласны, то всю семью расстреляют. Место в коляске было только для одной – ее увезли. Надя так и осталась ждать второго рейса, стоя на крыльце дома и умываясь слезами. Но у судьбы на девушку были другие планы. Оказывается, гарнизону приказали срочно сняться с места, и мотоциклист едва успел догнать своих.

На другой день Надя ушла в лес к партизанам, она понимала, что оккупанты или угонят в Германию, или надругаются, от этого зверья можно ждать лишь беды. Как девушка становится воином? Когда в жизни появляется то, ради чего готова пожертвовать собой. Надя любила страну, свою семью и поклялась, что будет бороться с врагом беспощадно. Это не высокие слова, а ее убеждения. Мужество меряется не мышцами и ростом, а внутренним несгибаемым стержнем. В 15-м отряде «Сокол» бригады Алексея Данукалова она научилась метко стрелять из любого положения, не целясь, работать с ножом и в боях без правил мало кому уступала. Говорит, что преодолевала страх, чтобы не потянулся он за ней во взрослую жизнь. Ходила на задания: в разведку, минировала железную дорогу, вместе с бойцами отбивала у немцев обозы с продовольствием и медикаментами, участвовала в спецоперациях.

В 1927 году в родном селе атеисты-коммунисты разбили церковь, но мать с детских лет учила девочку в минуту опасности обращаться к Небесам с просьбой оградить силой животворящего Креста. Вот и не поверь после этого в мощь молитвы, если Надю, вышедшую из легендарного прорыва фашистской блокады партизанами Полоцко-Лепельской зоны, даже не царапнуло. Фашисты бросили против народных мстителей 60 тысяч карателей, авиацию, танки, артиллерию, и все же в ту трагическую ночь с 4 на 5 мая 1944 г. они разгромили врага и вывели из окружения 16 тысяч мирных жителей. Для нее лично все осложнил раненый боец, которому раздробило колено. Вокруг топкое болото, где и на здоровых ногах нелегко передвигаться, а тут прыгающий на одной ноге человек. Но она не бросила парня, довела до партизанского штаба, где передала медсестре.

Никогда не забудет, как хотела напиться воды из колодца, а местный старик предупредил: «Нельзя, детка, там фашистский «бутерброд»...» Жестокость, доведенная до садизма: немцы нанизали младенцев на штык и бросили в колодец…

Надежда Егоровна говорит, что главный враг фашизма – человек, и мир захлебнулся бы в крови, если бы наш народ не победил.

Надя вышла замуж за односельчанина Василия Кальверша, его дед был латыш. Родила четверых детей. На 9 Мая они с супругом надевали пиджаки с медалями и торжественно шли на встречу ветеранов. 60 лет, взявшись за руки, – такая между ними была любовь. Василия уже нет, а Надежда Егоровна продолжает рассказывать о войне, о подвиге, так высоко возносящемся над обычными делами, чтобы люди обретали веру в себя…

Что с бою взято, то свято

– Цена войны написана аккуратными буквами на тысячах табличек, установленных над солдатскими могилами, – говорит ветеран войны из Лепеля **Елена Ивановна Шкирандо**. – И поверьте мне, в этих могилах лежат самые лучшие, храбрые, добрые, честные, именно они первыми жертвуют своей жизнью.

На войну она попала,


Елена Ивановна Шкирандо

когда Красная Армия стала гнать врага до Берлина. Шли бои за освобождение Латвии. Помнит местечко Ауцы – выгодный рубеж и для нас, и для немцев. Ауцы переходило из рук в руки 12 раз. Наконец его взяли – из 450 бойцов в живых осталось 50. Уже били «катюши», снаряды пролетали над головой и рвались километрах в трех. Земля буквально дрожала, а ей, взвалив на плечи 15-килограммовую катушку, которую звали «нервом армии», надо восстановить оборванную связь, обеспечивая ею командование. Не случайно Рузвельт в телеграмме Сталину в июле 1944 года писал, что больше всего на свете он хотел бы посмотреть, как русским удается поддерживать связь с наступающими войсками. В связистов целились снайперы, им приходилось прокладывать линию под пулями, в сплошном дыму, в дождь и холод.

Елена Ивановна не скрывает, что было страшно, но она считала, что тот, кто ценит свою жизнь больше всего остального, на самом деле очень опасный человек. Именно среди таких наибольший процент предателей и трусов.

В освобожденной Риге встретила Победу. В особняке, брошенном немцами, распорола матрацы и сделала костюм клоуна. В нем и «зажигала», потешая всех, ведь радости было столько!

В августе 1945-го возвратилась в Беларусь, окончила юридическую школу, работала нотариусом. Вышла замуж за Андрея Платоновича Шкирандо, вместе они вырастили троих детей. Вспоминая военное время, Елена Ивановна, как заклинание, повторяла: только бы никогда это не повторилось! Но война уже в наши дни ворвалась в судьбу ее родной внучки Инги. Девушка уехала в Москву на работу и там в нее влюбился сириец. Инге парень понравился, но как к белорусской невесте отнесутся его родные? Путешествие в Сирию оказалось счастливым. Молодые поженились, остались жить в Москве. А когда в США взорвали башни-близнецы, неизвестные сожгли полрынка, директором которого был муж Инги. В Москве то и дело нападали на людей «кавказской внешности». Переживая за супруга, Инга предложила: давай уедем к тебе в Алеппо. А вскоре город захватили игиловцы. Чудом удалось вырваться из Алеппо с тремя детьми. В Беларуси их не приняли как беженцев, не нашлось работы, негде было жить. Помощь пришла от друзей из Германии. Сейчас Инга с мужем работают, у них пятикомнатная квартира, и бабушка говорит, что пришел черед Германии заплатить за все ее военные муки…

Судьба берегла

О том, что война – праздник смерти, а люди в ней, как оторванные от причала лодки, на встрече ветеранов в лепельском пансионате «ЛОДЭ» говорили бывшая узница фашизма **Валентина Алексеевна Дубкевич** и дитя войны **Павел Ефимович Быстрицкий**. Им повезло больше других: Валентина


Валентина Алексеевна Дубкевич


Павел Ефимович Быстрицкий

работала у байера, который садил девочку с собой за один обеденный стол и относился к ней хорошо. Она ухаживала за стадом из 12 коров. Хозяин не знал русского, а она – немецкого. Общались с помощью словаря. Доила и кормила животных, убирала навоз, мыла фляги и драила полы. В 1945-м ее освободили американцы и передали своим. Дома Валя доучилась в школе, а потом стала первоклассным поваром и проработала в железнодорожном ресторане всю жизнь. Муж Николай Осипович тоже отличный повар. Дочери Светлана и Жанна в юности уехали в Ленинград, там вышли замуж и остались навсегда. Пенсия у Валентины Алексеевны – не разгуляешься. Спасает огород под окном, где она выращивает зелень и цветы, и умение шить теплые бурки для стариков. Их быстро раскупают. Недавно в дом провели газ и воду, не надо теперь таскать ведра из колонки и заготавливать дрова – живи не хочу! Только сил у 92-летней женщины уже мало.

Павел Быстрицкий попал в рабство к немцам ненадолго. Из-за сестры-партизанки всю семью взяли в заложники. В тюрьме оказались отец, мать, Павел, 10-летний брат и 5-летняя сестра. За младших поручилась тетя, и их отдали ей. А Павла отправили на строительство новой дороги, потому что трассу Витебск–Минск блокировали партизаны. Заставляли рыть окопы. Досаждали холод и голод. Зима лютая, спали в дощатом сарае на лапнике, буржуйка в нем быстро остывала. А стоило закашлять – и ты уже не жилец. Спас случай. Однажды Павел увидел из окопа полуторку. За рулем был одноклассник сестры, которого хорошо знал. «Вовка!» – крикнул Павел, и тот, мгновенно сообразив, открыл кабину и сказал: «Прыгай и пригнись!» Так и вывез его от неминуемой смерти. Павел Ефимович дождался освобождения, пять лет отслужил на флоте. Поступил в Минске в Политех, а потом – в Белорусский институт механизации сельского хозяйства. Работал главным энергетиком на экскаваторно-ремонтном заводе. У него двое детей и двое внуков. И когда те спрашивают о войне, Павел Ефимович отвечает, что они счастливые хотя бы потому, что им уготован мир.

***

Сколько пережили эти люди – послевоенную разруху, нищету, время, когда легко объявляли врагом народа, вождей, обещавших золотые горы, мифы пятилеток, перестройку, развал некогда большой страны, идеалы которой они защищали! Но не озлобились, не пали духом, по-прежнему любят жизнь и считают ее щедрым даром, с лихвой окупающим все горести.

Лилия ЛОМСАДЗЕ,
Лепель

ПАЗІЦЫЯ

Хто за мараторый на смяротнае пакаранне?

Член Савета Рэспублікі Віктар Чайчыц упэўнены: беларускае грамадства ўжо гатова да абмеркавання пытання аб увядзенні мараторыя на прымяненне смяротнай кары. На ягоную думку, калі сёння вынесці на ўсенародны рэферэндум пытанне, ці трэба адмяняць смяротнае пакаранне, *«у большасці сваёй грамадзяне скажуць, што не згодны з гэтым»*. У той жа час, дадаў ён, на карысць гатоўнасці грамадства да абмеркавання пытання аб увядзенні мараторыя сведчаць выпадкі, калі нават пацярпелыя просяць не асуджаць вінаватых на смяротнае пакаранне. Пацярпелыя кажуць, што для вінаватага *«гэта занадта лёгкае пакаранне, што ён павінен жыць і мучыцца ад усведамлення ўчыненага»*, зазначыў член Савета Рэспублікі.

«Хутчэй за ўсё, мы будзем рухацца да таго (і я гэта падтрымліваю), што народ будзе прыхільнікам увядзення мараторыя на прымяненне смяротнага пакарання», – сказаў Чайчыц.

ТЫМ ЧАСАМ

Дэпутаты будуць супраць?

Член камісіі па эканамічнай палітыцы ніжняй палаты парламента дэпутат ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Ганна Канапацкая** лічыць, што дэпутаты самі павінны ініцыяваць у парламенце абмеркаванне пытання аб увядзенні мараторыя на прымяненне смяротнай кары. Гэта стала б праявай іх «палітычнай волі», дадала Канапацкая.

У той жа час старшыня камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў **Андрэй Навумовіч**, які ўзначальвае ў беларускім парламенце рабочую групу па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання, выказаў меркаванне, што калі цяпер вынесці пытанне пра мараторый на абмеркаванне парламента, большасць дэпутатаў прагаласуе супраць.

Дарэчы, рабочая група па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання як інструмента пакарання, які ўжываецца ў Беларусі, дзейнічае ў Нацыянальным сходзе з 2013 года.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Даплата – 70 капеек

У студзені адзначыла 75-годдзе, і мне да пенсіі пачалі выдаваць прыбаўку за ўзрост. Зараз чытаю, што з мая гэтая прыбаўка павялічыцца. Але не магу зразумець, на колькі. Па радыё сказалі, што на 34 рублі 47 капеек, а суседка сцвярджае, што ўсяго на 70 капеек. Я, зразумела, больш давяраю афіцыйнай інфармацыі. Але на ўсялякі выпадак звяртаюся ў любімую газету: патлумачце, хто мае рацыю?

А.К.ШЭІНА,Мінскі раён.

Напэўна, наш адказ вас не парадуе, але права ваша суседка. Прыбаўка да вашай пенсіі з 1 мая будзе нязначнай.

Патлумачым, чаму.

Справа ў тым, што ў Беларусі некаторыя сацыяльныя выплаты, у тым ліку і даплаты да пенсій асобам ва ўзросце 75 гадоў і вышэй, а таксама памер мінімальнай працоўнай і сацыяльнай пенсіі залежаць ад бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. Павялічваецца ён – растуць і гэтыя выплаты.

Менавіта з мая БПМ вырас з 180 рублёў 10 капеек да 183 рублёў 82 капеек, значыць, на 2,1 працэнта.

Як налічваюцца надбаўкі да пенсіі людзям сталага ўзросту, якім споўнілася больш за 75 гадоў? Справа ў тым, што яе памер складае 100% мінімальнай пенсіі па ўзросце для пенсіянераў, якім за 80, і 75% мінімальнай пенсіі па ўзросце для пенсіянераў ва ўзросце ад 75 да 80 гадоў. А ўжо памер мінімальнай пенсіі па ўзросце якраз-такі залежыць ад бюджэту пражытачнага мінімуму і складае 25% БПМ. Павялічваецца бюджэт пражытачнага мінімуму, павялічваецца і мінімальная пенсія. І адпаведна – надбаўкі да пенсій для ўзгаданай катэгорыі пенсіянераў. Таму з 1 мая прыбаўка да пенсіі тым, каму за 75, складзе толькі 2,1%.

Каб беларусам, якія атрымліваюць выплаты, прывязаныя да БПМ, было зразумела, наколькі большым стане іх памер, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны нават падрыхтавала адпаведную табліцу. Ёсць там і радок пра непрацуючых пенсіянераў, якія дасягнулі 75 і 80 год, і якім, згодна з указам А,Лукашэнкі ад 16 студзеня 2012 года, усталяваны гэтыя дабаўкі да пенсіі.

Від надбаўкі да пенсіі	Памер да 1 мая ў рублях	Памер з 1 мая ў рублях	Колькі склала павышэнне ў рублях
Непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі 75 год	33,77	34,47	0,70
Непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі 80 год	45,03	45,96	0,93

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

З НАГОДЫ

Ці можна кіраваць аўтамабілем у 92 гады?

Днямі Следчы камітэт па г.Мінску паведаміў пра ДТЗ са смяротным зыходам. Здавалася б, такіх аварый на дарогах сталіцы і Беларусі адбываецца, на жаль, нямала. Вадзіцель учыніў наезд на пажылую жанчыну, якая пераходзіла праезную частку на дазваляльны сігнал святлафора. Пацярпелая была дастаўлена ў бальніцу, дзе праз некалькі гадзін памерла.

Але што падалося незвычайным: за рулём машыны сядзеў кіроўца, якому 92 (!) гады. Цяпер у адносінах да яго распачата крымінальная справа па ч.2 арт.317 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Ці мог ён сесці за руль у такім сталым узросце?

– *Абмежаванняў па ўзросце для кіравання транспартным сродкам паводле закона «Аб дарожным руху» няма*, – патлумачыла сакратар вадзіцельскай камісіі медыцынскага цэнтра «Гарызонт» **Наталля Мілько**. – *Абмежаванне можа выставіць медыцынская камісія, якая выдае кіроўцу даведку, але толькі па стане здароўя. І супрацьпаказанняў, якія перашкаджаюць кіраванню транспартнымі сродкамі, вельмі шмат: і па зроку, і па сэрцы, і па захворваннях нервовай сістэмы і г.д. Асобы, якім споўнілася 65 гадоў, павінны праходзіць вадзіцельскі агляд раз у 2 гады. Калі кіроўца пакутуе на нейкае захворванне, меддаведка выдаецца на год, і тады штогод ён павінен яе спраўджваць. На адзін год даведка можа быць выдадзена нават 20-гадоваму кіроўцу.*

Марыя ЭЙСМАНТ.

Народная Воля http://www.nv-online.info 5 МАЯ 2017 г.

РАКУРС

700 ЕВРО ЗА... ДЕТСКИЙ САД

«Народная Воля» поинтересовалась, сколько стоит дошкольное образование в частных садах и клубах. Как оказалось, спрос на услуги негосударственных дошкольных заведений немалый. И в некоторые из них попасть весьма непросто. Даже несмотря на довольно высокую стоимость посещения. Однако есть родители, готовые выкладывать и 500, и 800 евро в месяц за то, чтобы ребенок посещал, казалось бы, совершенно обычный детский сад.

Запись на два года вперед

Как известно, чтобы попасть в государственный детский сад, нужно заблаговременно встать на очередь в местном исполкоме. Иначе, когда вы решите отдать ребенка в сад, свободных мест там может не быть. Поэтому многие записываются в сад почти сразу после выписки из роддома.

Как выяснилось, в некоторые частные детсады тоже нужно записываться заранее.

Так, например, в ЧУО «Учебно-педагогический комплекс детский сад – средняя школа «Эко-Эл» уже сформированы детсадовские группы на сентябрь этого года. В группах не так уж и мало человек – около 20. А в листе ожидания – уже 14. Последние надеются, что, может быть, кто-то откажется от этого детсада и им повезет.

К сведению: детсад «Эко-Эл» принимает детей с трех до семи лет, работает 5 дней в неделю с 8.00 до 18.30. Образование ведется по учебным программам Министерства образования Республики Беларусь, авторским программам по изучению английского языка В.Мещеряковой, немецкого языка (патронаж Института Гете). Есть бассейн.

В месяц за детсад, который находится в конце проспекта Победителей, нужно заплатить **550 евро.** Сейчас запись ведется уже на 2019 год!

"Да, не удивляйтесь – у нас запись на два года вперед, – рассказали нам в "Эко-Эл". – *Дело в том, что у нас еще работает начальная школа, и, чтобы в нее попасть, нужно пройти наш детский сад. Соответственно, родители продумывают все заранее.*

У нас всегда есть набор, хотя мы себя совершенно не пиарим. С 1996 года мы ни разу не давали рекламу своего учебного заведения, но о нас знают. И если здесь учились старшие дети, значит, придут и младшие.

На следующий учебный год у нас все расписано. Мы живем учебными годами. Чтобы попасть в наш детсад, к сентябрю ребенку должно быть три года. Посреди года к нам не попадешь – просто нет мест. И уж если к нам начинают ходить, то ходят до конца. На сентябрь все расписано, в листе ожидания – больше десятка человек. Если кто-то откажется, может, вы попадете. Но это маловероятно, я вам честно говорю. Так что не буду вас обнадеживать и обещать, что, может быть, место освободится, подождите. Если вам уже пора в детский сад, значит, подыскивайте что-то более реальное.

Что касается цены, то точно знаю, что мы не самый дорогой детский сад в Минске».

По системе «все включено»

Обучение в частном детском саду и начальной школе **«Зеленый холм»** стоит **790 евро.**

«Мы обучаем классическому британскому английскому языку с трех лет, мы даем интенсивный курс английского языка с постановкой правильного звукопроизношения и подготавливаем к Кембриджскому экзамену Young Learners Exams (YLE), – рассказывают в «Зеленом холме». – *«Зеленый холм» – единственный частный детский сад и начальная школа, в котором включен в ежемесячную оплату такой большой перечень услуг в оздоровительном и развивающем направлениях. У нас есть собственный бассейн, сауна, фитобар, комната приема кислородных коктейлей и ароматерапии, кабинет массажа, спортивный зал (включая ЛФК). При строительстве здания и в отделке помещений использовались экологически безопасные материалы (кирпичные стены, не способные накапливать пыль, стеклообои и т.д.). У нас установлена одна из самых современных систем очистки воздуха. В нашем детском саду определенные правила: мы не допускаем в группу детей с признаками простудных заболеваний. В саду работает врач-педиатр».*

В группах в «Зеленом холме», как правило, до 12 человек.

«Сейчас мы формируем группы на сентябрь 2017 года, – говорят в саду. – *Приезжайте, посмотрите, оцените все сами и, если понравится, оставайтесь с нами».*

ДЛЯ СПРАВКИ

Частные детские сады – официально зарегистрированные частные учреждения образования. Они размещаются в зданиях, выведенных из жилищного фонда, соблюдают все нормативные требования по меню, распорядку дня.

Заведения, зарегистрированные под иными названиями (например, клубы), могут не придерживаться программы обучения, утвержденной Министерством образования, у них более свободное меню и так далее.

Свои достоинства и недостатки есть в обоих вариантах.

Цена вопроса

Название	Цена в месяц
«Давайте расти»	600 €
«Маленький принц»	580 $
«Кэй-Эс-Ви»	620 $
«Апельсин»	11.100.000 бел. руб.
«Ребенок будущего»	600$
«Зеленый холм»	790€
Global Child	730 €
«Елисеевы поля»	600€
«Как дома»	500 $
«Изумруд»	580 рублей в месяц за полный день, или 360 – за неполный

Давайте расти!

Частный детский сад и начальная школа **«Давайте расти»** – официально зарегистрированное учреждение образования.

"*У нас строгое соответствие всем нормам СанПиН*, – рассказывают в саду. – *Группы маленькие – до 15 человек. На пять детей – один взрослый, в группе постоянно находятся два воспитателя и один помощник.*

Особое внимание уделяем физическому и психологическому здоровью детей: 1–2 раза в неделю детей осматривает опытный педиатр, медицинская сестра проводит профилактические процедуры, а также реабилитацию после болезни».

Месяц в садике «Давайте расти» стоит **600 евро**.

«Для детей, проходящих адаптационный период, мы предусмотрели почасовую и подневную оплату: 3 евро в час и 33 евро в день. На адаптацию в среднем отводится один месяц», – объясняют в саду.

Внимание, скидки!

*Пожалуй, за последнее время лишь в Международном образовательном клубе **Global Child** немного снизили цены на посещение детского сада. Раньше месяц здесь стоил **850 евро**, сейчас – **730.***

"*Наша школа раннего развития применяет уникальную методику билингвальной системы образования*, – рассказывают в клубе. – *Малышам преподносят английский язык в игровой форме. С 4 лет учат игре в шахматы – это развивает память, приучает к анализу ситуации.*

В школе раннего развития для детей воспитывают в каждом ребенке самостоятельность, ответственность, умение принимать правильное решение, способность преодолевать трудности.

Логопед клуба поможет при речевой задержке или особенностях произношения.

Global Child уже 7 лет предоставляет возможность школьникам изучать английский язык за рубежом. Партнеры клуба – Англия, Мальта, Испания и другие страны, где можно продолжить обучение в школах-пансионатах с 8 до 17 лет, в семье преподавателей".

Билингвальный детсад находится за Национальной библиотекой, в адаптированном коттедже.

Летом здесь будет работать летняя школа, до 30 апреля на обучение в летней школе действует скидка – одна неделя будет стоить ***170 евро***.

"Почему такая высокая цена – 730 евро за детсий сад? – уточняют в детском саду. – *У нас работают носители языка, индивидуальный подход к каждому ребенку. Группы заполнены, никто на высокие расценки не жалуется".*

И больше никаких доплат

В самом центре Минска на улице Заславской уже не первый год работает частный детский сад **«Маленький принц».**

Цена – ***580 долларов*** в месяц по курсу Нацбанка.

«В эту сумму входят все поездки в театры, в музеи и кинотеатры, подарки на все праздники, – рассказывают в саду о своих правилах. – *Родители у нас больше ничего не доплачивают.*

Если ребенок заболел, мы возвращаем стоимость питания, это примерно 20 процентов дневного содержания ребенка. По Минску у нас не самая высокая цена, есть сады и подороже, где цены совсем сумасшедшие. Мы находимся в средней ценовой категории.

В год по уважительным причинам можно пропустить 45 дней. Группы у нас небольшие – до 14 человек. С детьми занимается логопед – столько, сколько нужно. С 8.00 до 16.00 ребенка сопровождает доктор. Если сопли, то нос и промоют, и прогреют...»

В ТЕМУ

Не так давно российское Агентство стратегических инициатив провело большое исследование государственных и частных детских садов, и вот к каким выводам пришло.

В частных садах больше педагогов с высшим образованием (70% против менее 30% в государственных, где больше представлено среднее специальное образование).

В частных садах больше представителей современного поколения, тогда как в государственных работают более возрастные сотрудники. Кстати, этим же объясняется и выбор учебных программ. Более 80% госсадов отдают предпочтение программе, которая основана на разработках 60-х годов прошлого века.

Еще одна разница – количество детей в группах. Очевидно, что в государственных садах детей на одного педагога приходится гораздо больше. А это значит, что в частном саду и внимания одному ребенку также оказывается больше.

Ни в государственных, ни в частных садах не уделяется достаточно внимания повышению квалификации и развитию персонала. Общий уровень качества персонала примерно одинаков.

Но, может быть, это и не нужно? Статистика говорит, что родители дошкольников в абсолютном большинстве предъявляют к саду только три требования: лишь бы ребенок не болел, общался со сверстниками и развивался.

Марина КОКТЫШ.

ЭКСПЕРТИЗА

«Содержание детского сада – дело дорогое»

С одной стороны, 500–700 евро за детский сад – дорого. Для некоторых белорусских семей это зарплата обоих родителей, плюс пенсия бабушки или дедушки.

С другой – частные садики и детские клубы, созданные по типу детсадов, укомплектованы под завязку. Недобора нигде нет.

О формировании цен на услуги частных детских садов «Народной Воле» рассказала учредитель и руководитель Международного образовательного клуба Global Child Илона ГЕРАЩЕНКО.

– Как и любой вопрос, цена детского сада имеет две стороны, – *объясняет Илона.* – С одной стороны, это доходы граждан. С другой – расходы сада. 400–500 евро сегодня – это средний доход наемного работника. Но люди сегодня работают не только по найму. Есть фрилансеры, которые работают на себя. Есть высокооплачиваемые профессии, в которых зарплата гораздо выше средней по стране. Есть собственники бизнесов, которые не имеют фиксированной зарплаты, но получают прибыль от работы всей компании. Есть те, кто живет на проценты от вкладов в банках или на доходы от сдачи в аренду жилья. Для каждого сегмента есть и свое предложение в области дошкольного образования.

Но о каком бы сегменте мы ни говорили, общеизвестный факт, который подтверждается примерами многих частных садов и статистикой: содержание детского сада – дело дорогое. Прибыльность в нем – минимальна. Этот бизнес держится на личной инициативе тех, кто его ведет.

Стоимость услуг детского сада может свидетельствовать о том, какие кадры подбираются (профессиональные педагоги или аниматоры и няни, которые присматривают за детьми), какое будет у ребенка питание, сколько детей будет в группе.

Как правило, чем ниже цена, тем ниже качество по всем вышеперечисленным критериям. Это объективный фактор, хотя многие пытаются сказать, что и в государственных детских садах хорошие педагоги и питание. Я не спорю! Но знаю, сколько стоят услуги профессиональных педагогов и по какой цене продаются продукты в магазине.

Поэтому и в государственном, и в частном секторе в сфере дошкольного образования работают энтузиасты. Это совершенно точно.

ХВАЛЮЮЧАЯ ТЭМА

Як можна будзе жыць паміж могілкамі і сметнікам?

Людзі, якія стаміліся скардзіцца на праблемы, звязаныя з блізкасцю сметніка, баяцца, што побач з іх дамамі яшчэ размесцяцца новыя гарадскія могілкі на 30 тысяч месцаў.

Дарога на сметнік

Яшчэ некалькі гадоў таму былы вайсковы гарадок Сосны, які нядаўна стаў часткай Мінска, быў ціхім і зручным месцам жыхарства для соцень сем'яў. Прэтэнзіі да інфраструктуры былі тыповыя: не хапае дзіцячага садка, нязручна размешчаны прыпынкі грамадскага транспарту, недастаткова пешаходных пераходаў. Але па-сапраўднаму сур'ёзныя праблемы пачаліся, калі з-за будаўніцтва мемарыяльнага комплексу на месцы былога лагера смерці ва ўрочышчы Благаўшчына закрылі дарогу да гарадскога сметніка. Шлях смеццявозаў стаў пралягаць па жылой вуліцы Паўлоўскага ў Соснах.

Разам са спецтранспартам у Сосны прыйшлі шум, дрэнны пах, раскіданае з кузаваў смецце. На адрэзку дарогі, якая праходзіць каля жылых дамоў, цяжкія самазвалы ездзяць з хуткасцю 80–90 км/г – знакаў, якія абмяжоўвалі б хуткасць, тут няма. Пры гэтым, нягледзячы на тое, што спецыяльны транспарт пачаў ездзіць фактычна па гарадской вуліцы, нармальныя ходнікі так і не з'явіліся. Мясцовыя называюць цудам тое, што за зіму, калі абапал дарогі былі звалены гурбы снегу, не здарылася аварый і наездаў.

Вырашыць праблему дарогі намагаліся па-рознаму. Падчас выбараў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дапамагчы абяцала кандыдат **Аксана Няхайчык.** Але ўжо з дэпутацкага крэсла Няхайчык паскардзілася на недахоп бюджэтных сродкаў і развяла рукамі. Часу адказаць на ліст "Народнай Волі" ў дэпутата таксама не знайшлося.

Жыхары Соснаў звярталіся то ў адну інстанцыю, то ў другую, пакуль не даведаліся, што новая дарога можа з'явіцца ў іх раёне разам з... могілкамі.

Дом ці дамавіна?

Як толькі Сосны далучыліся да Мінска, гарадскія ўлады кінулі позірк на тэрыторыю былога ваеннага гарадка. Мясцовым распавялі пра новую дарогу да сметніка, якая быццам бы можа з'явіцца ў сувязі з перабудовамі. Перамены прэзентаваліся як маштабныя, але не глабальныя: запланавалі пашырыць тэрыторыю завода "Радыян" і аднесці да прамзоны кавалак лесу, які раней адносіўся да прыродаахоўнай зоны.

"Спачатку нам было шкада, што вырубяць кавалак здаровага лесу, – распавяла "Народнай Волі" мясцовая жыхарка Аксана. – *Пры гэтым ніводнага слова не было сказана пра будаўніцтва, маўляў, пытанне стаіць толькі наконт пашырэння тэрыторыі завода "Радыян". Але потым мы літаральна выпадкова даведаліся, што менавіта на вызваленых абшарах могуць з'явіцца акумулятарны завод, цэх забою жывёлы і... новыя гарадскія могілкі на 30 тысяч месцаў".*

Жыхары катэджнага пасёлка, які фактычна з'яўляецца часткай Соснаў, упэўнены, што такое суседства, па-першае, негатыўна адаб'ецца на экалогіі раёна, а па-другое, знізіць кошт нерухомасці. Многія ўклалі ў свае дамы дзясяткі тысяч долараў і гады працы. Няўжо замест ціхага жыцця побач з горадам людзі атрымаюць сумніўнае суседства з некропалем?

У Мінгарвыканкама планы наконт Соснаў цьмяныя – ідзе пошук інвестараў, вывучаюцца прапановы. У адміністрацыі Заводскага раёна Мінска "Народнай Волі" не змаглі распавесці, што менавіта будзе будавацца там, дзе сёння шуміць здаровы лес, месціцца завод "Радыян", знаходзяцца лецішчы. Толькі дакладна вядома, што тэрыторыя будзе аднесена да прамзоны, але пра будучыя могілкі на тэрыторыі іх раёна чыноўнікі пакуль нічога не ведаюць.

Горад (без) мёртвых

Ні на адным з генеральных планаў тэрыторыя, якую збіраюцца асвоіць каля Соснаў, не пазначана як месца, дзе маглі б размясціцца могілкі. Між тым Мінску проста неабходна новае месца для пахаванняў. Сёння ў сталіцы працуюць толькі адны Заходнія могілкі, якія займаюць плошчу каля 50 гектараў. Паводле падлікаў спецыялістаў, рэсурс гэтага пагосту будзе вычарпаны не больш як за два гады.

"Новыя могілкі павінны быць плошчай не менш за 80–100 гектараў, каб на працягу доўгага часу не думаць аб пабудове наступных, – цытуе агенцтва "Мінск-Навіны" словы прадстаўніка УП "Спецкамбінат КБА" **Сяргея Тура**. – *Але цяпер альтэрнатыўных варыянтаў размяшчэння новых могілак няма".*

Адказ жыхарам Соснаў камітэта па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама пэўнасці не дадае: *"Магчымасць размяшчэння гарадскіх могілак будзе вызначана горадабудаўнічым праектам дэтальнага планавання на тэрыторыі камунальна-складской зоны 119П5-кс, які распрацоўваецца на сённяшні дзень".*

Між тым крыніцы "Народнай Волі" ў "Мінскпраекце" пацвердзілі, што план новых могілак існуе, але не вядома, дзе менавіта будзе размешчаны новы некропаль. Новыя месцы пахаванняў спачатку планавалі зрабіць у 40 кіламетрах ад Мінска ля вёскі Казекава, потым у 15 кіламетрах ад сталіцы ля Фаніпаля. Але ад планаў адмовіліся, бо, паводле нормаў, пагосты не могуць змяшчацца так блізка да населеных пунктаў. Ці ўратуе гэта Сосны? Пакуль жыхарам з упэўненасцю заявілі толькі адно: будаваць новую дарогу ці праводзіць рэканструкцыю вуліцы Паўлоўскага да 2030 года дакладна не будуць.

Марыя МАЛЕВІЧ.

РЭГІЁН

Атамная станцыя ў Астраўцы мае патрэбу ў ратавальніках з іншых абласцей

На працу запрашаюць кандыдатаў у добрай фізічнай форме.

Аб'явы аб вакансіях ратавальніка і кіроўцы-ратавальніка друкуюць раённыя газеты Віцебскай вобласці. Вольныя месцы тлумачаць пашырэннем падраздзяленняў на аб'екце.

Галоўнымі патрабаваннямі да кандыдатаў называюць адсутнасць правапарушэнняў і добрую фізічную форму.

– *У якіх войсках служылі, якую пасаду займалі?* – першае пытанне ў аддзеле кадраў. – *Трэба здаваць фізічныя нарматывы: падцягванне не менш за 15 разоў, бег... Пасля гэтага ўся падрабязная інфармацыя.*

Васіль КОРЗУН.

ПИСЬМО В РЕДАКЦИЮ

Помогите бедным людям…

Здравствуйте, уважаемые товарищи!

Пишет вам пенсионер из города Березы Николай Федорович Кречет.

У меня к вам большая просьба: попросите через свою газету президента Александра Григорьевича, чтобы он отменил несправедливую приватизацию советских квартир, от которой пострадала самая бедная прослойка белорусских людей.

Дело в том, что 93 процента людей приватизировали советские квартиры бесплатно, а 7 процентов обидели, их заставили платить за те квартиры, которые они получали за доблестный труд или за службу Родине бесплатно, как все.

Вот пример. Моя соседка Людмила Владимировна Орлова заплатила первый взнос за свою квартиру в сумме, эквивалентной 1700 долларам, а теперь ей нужно платить 40 лет ежемесячно по 32 рубля, чтобы выплатить стоимость квартиры полностью. Ее муж летал на истребителе 30 лет, когда ушел на пенсию, разбился на автомобиле, квартиру не успел приватизировать бесплатно. И таких у нас много. Где же справедливость? Все кричат, что они за народ, а 7 процентов белорусов – это что, не народ? За что его обидели?

Помогите, только на вас одна надежда! Мы куда только не писали, везде говорят, что люди сами виноваты, что не успели приватизировать свои квартиры бесплатно. А в России приватизация во времени не ограничена, люди приватизируют квартиры свободно, а у нас было выделено на это только 7 лет (с 1992-го по 1999 год).

Помогите бедным людям! Они заплатили первый взнос в размере 10 процентов, а зачем же еще 40 лет их мучить?

Николай Федорович КРЕЧЕТ.

г.Береза Брестской области.

ПОЗИЦИЯ

Я – за частную собственность на землю

Александр Лукашенко как-то заявил, что Беларусь пока не готова принять закон о праве частной собственности на землю. Таким образом, главным богатством и дальше будут распоряжаться чиновники от власти. Будет, как всегда, существовать командно-административная система управления экономикой страны.

Полная дискриминация в Беларуси частной собственности на землю привела к тому, что она перестала быть важным и полезным рычагом развития эффективной экономики. Почему бы нам не обратиться за опытом к многим зарубежным странам? Да зачем далеко ехать, у наших соседей – поляков, литовцев, латышей – эта проблема решена полностью. У них нет колхозов, совхозов, но каждый гектар угодий имеет своего хозяина. Это не значит, что все сами обрабатывают землю. Как распорядиться собственностью – решений может быть много. Крестьянин может вступить в любой кооператив и получить прибыль.

В развитых странах сельскохозяйственная кооперация стала органичной составной частью агропромышленного комплекса. В США, например, важнейшим звеном АПК стали фермерские сельскохозяйственные кооперативы. И, что характерно, услуги и товары своим членам кооперативы предлагают по себестоимости, а всем остальным – по рыночным ценам. Около 20 процентов полученной прибыли возвращается кооператорам, а остальное идет на развитие фондов. С точки зрения видов услуг в США различают три типа кооперативов: бытовые, снабженческие, сервисные. Приблизительно половина фермеров принимает участие в деятельности одного или нескольких кооперативов.

В Японии, например, насчитывается около пяти миллионов фермеров, и все они охвачены кооперативным движением. Такое положение сложилось в результате действия закона о сельскохозяйственных кооперативах, в соответствии с которым все крестьяне автоматически становились членами кооперации, а через нее правительство проводило аграрную политику.

А что мы имеем в Беларуси? Всего около двух тысяч фермерских хозяйств, не связанных с кооперативным движением. Отсутствует правительственная политика поощрения кооперативного движения.

В АПК развитых стран мощным стимулом развития кооперации являются налоги. Во многих государствах паевые взносы в кооператив совсем не облагаются или облагаются минимальными налогами. В учет принимается лишь товарная продукция кооперативов или их внешние услуги.

Таким образом, развитие кооперации фермеров в разных развитых странах – богатый опыт для Беларуси. Он заслуживает детального изучения и использования в практической деятельности с учетом современного состояния сельского хозяйства. В этой связи представляются наивными попытки решить проблему развития экономики другими методами, то есть без введения частной собственности на землю.

Александр ЗАРЕНОК, экономист.

г.Калинковичи.

З НАГОДЫ

«Небеларуская» станцыя

Калі я бываю на станцыі "Беларусь", што ў старажытным Заслаўі, то ў галаву лезе такая думка: калі яна носіць такую назву, то і павінна быць беларускай – пэўным адлюстраваннем нашай краіны, яе тварам. На жаль, з нацыянальнага тут толькі беларускамоўны расклад руху электрычак. Усе аб'явы па станцыі гучаць на рускай мове. У прылягаючых будыначках прадаюць толькі "чай" і "кофе", а не "гарбату" і "каву".

Паслугамі станцыі карыстаецца вельмі шмат людзей, і не толькі беларусаў, бо Заслаўе мае цікавую гісторыю, яго наведваюць як нашы суайчыннікі, так і замежныя госці. Калісьці тут нават пабываў тагачасны прэзідэнт Францыі Жорж Пампіду, які сустракаўся з генсекам Брэжневым. Думаю, што на замежнікаў разлічаны і станцыйны туалет, бо на ім лацінкай напісана "WC". Хтосьці аднойчы заўважыў, што аб дзяржаве можна меркаваць па яе прыбіральнях. Мяркуючы па нашых, можна сцвярджаць: справы дрэнь. Аказваецца, пабудаваць ці адрэстаўрыраваць палацы прасцей, чем давесці да нармальнага ўзроўню прыбіральню, куды людзей ходзіць часам больш, чым у некаторыя палацы.

Вось у Міры адрэстаўрыравалі замак. Стаў ён вельмі прыгожы, прываблівае не толькі нашых турыстаў, але і замежных. Сам пасёлак прыведзены ў парадак, па-мойму, стаў залішне сучасным, згубіўшы свой даўнішні твар. Але ж зайдзіце (больш правільна – забяжыце, бо далёка ад аўтастанцыі) у туалет, і ваш настрой і ўражанні адразу сапсуюцца.

Гэта тычыцца не толькі Заслаўя ці Міра і не толькі гарадоў і гарадкоў, дзе на гэтыя мэты не хапае сродкаў, але і многіх нябедных арганізацый і фірмаў…

Іван КУРМАНОВІЧ.

СТОП-КАДР



Прыйшла вясна... Фота Віктара Малышчыца (nn.by).

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Почему государство оглохло?

Прочитав статью жителя Молодечно В.Картавенко «Государство не должно ждать, когда я умру…», я также решил обратиться в «Народную Волю». В государственных газетах просто не напечатают мое письмо.

Я также доверял государству и хранил свои сбережения в Сберегательном банке. В тот период я на собранные деньги мог купить не только квартиру, но и многое другое. Речь идет о сумме в 50 тысяч рублей, а это как минимум 7–8 легковых автомобилей.

Мне в этом году исполняется 80 лет. Вхожу в категорию так называемых детей войны, на долю которых выпало много бед и страданий. Нас гнали немцы в Германию, но после пребывания в лагере «Лесное» оставили в Барановичской области, где мы и встретили День Победы.

Нет смысла перечислять все трудности, которые выпали на долю нашего поколения. Хочу привести лишь один пример.

В нашей деревне из пятидесяти домов уцелело только пять. Наш дом был спален. Одно было спасение, что у нас была хорошая корова, которая прошла всю войну, вернулась с нами в село и на которой мы с матерью обрабатывали колхозное поле.

Теперь о другом. Мне вспоминается выступление А.Г.Лукашенко. В своей предвыборной речи на пост президента он обещал вернуть обещанные вклады в полном размере. В свое время П.Прокопович, возглавляя Национальный банк, даже называл время возврата денег, то есть с 2012 года. Обещанного, говорят, три года ждут, но на календаре уже 2017 год. Чего же ждут? Кто ответит честно на этот вопрос? Ведь долг платежом красен.

Если, к примеру, у государства нет денег, то есть много вариантов, как рассчитаться с людьми пенсионного возраста. Можно поставить вопрос перед Москвой, где когда-то принимались решения.

Если этого сделать нельзя, то нужно искать резервы внутри нашего государства. Сделать пострадавшим вкладчикам бесплатный проезд в транспорте, принять какие-то варианты с обеспечением лекарствами, медицинскими услугами и так далее.

Не так давно мы избрали новый парламент, давали наказы кандидатам в депутаты, но, попав в Овальный зал, никто даже не ставит вопрос о выплате вкладов. Все быстро забывают об обещаниях и думают только о том, как себя всем обеспечить.

Власть провозгласила, что наше государство социально справедливое, а значит – на первом месте забота о человеке. А что получается на самом деле? Даже наши деньги, отданные государству в долг, не возвращают, оставили пенсионеров в нищете.

Василий Семенович БОЛДЫШЕВ.

Минск.

БЫЛЬ

Іх трагедыя

Жылі-былі трое сяброў

Чэрвень 1939 года. Невялікі гарадок, які паводле ўмоў Рыжскага дагавора знаходзіцца пад панаваннем Польшчы, жыве правінцыяльнымі клопатамі. Дзейнічаюць лесаперапрацоўчы завод, чыгуначная станцыя, мэблевая фабрыка, турма, пабудаваная яшчэ пры царскай уладзе, управа польскай памежнай варты і польская памежная часць, даволі вялікая бальніца, гімназія... Як і ўсюды, лаўкі, невялікія майстэрні, шынкі. Жыхары займаюцца лесасплавам, рыбалоўствам, бо гарадок знаходзіцца на беразе хуткацечнай ракі.

Тры сябрукі – Аляксандр Завацкі, Казімір Вайцяхоўскі і Мікалай Грышкевіч – закончылі гімназію і робяць першыя крокі па здзяйсненні сваіх мар. Аляксандр вучыцца на інжынера, Казімір хоча стаць ваенным, а Мікалай – машыністам цягніка.

Бацька Завацкага працуе на лесапільным заводзе станочнікам, маці – хатняя гаспадыня, ёсць малодшая сястра Ганна. Трымаюць дзве каровы, свіней, розную птушку. Жывуць у сваім доме на ўскрайку горада. Саша мае здольнасці да тэхнікі. Змайстраваў нямала розных прылад для гаспадаркі.

У горадзе добрую славу мела сям'я Казіміра Вайцяхоўскага: бацька – ваенны начальнік пагранічнай управы, маці – выкладчыца польскай літаратуры і мовы ў гімназіі. Ёсць малодшая сястра Крысціна, якая вельмі падабаецца сябру Казіміра – Аляксандру. Жывуць у вялікай кватэры.

Радаваўся жыццю і Мікалай Грышкевіч: бацька – абходчык на чыгунцы, маці працуе ў швейнай майстэрні, ёсць малодшы брат Петрык. Жывуць у сваім доме.

Летам таго ж года Аляксандр паступіў у тэхнічны каледж, Казімір – у ваеннае вучылішча ў Варшаве. Мікалай уладкаваўся працаваць памочнікам машыніста на чыгунцы.

Грымнула вайна…

Але вось 1 верасня пачалася сусветная вайна. Казіміра адпраўляюць з вучылішча дадому як юнака, які па стане здароўя не можа браць удзел у баявых дзеяннях.

Неўзабаве ў горадзе з'яўляюцца войскі Чырвонай арміі, і Заходняя Беларусь вяртаецца ў склад СССР. Польская пагранічная варта атрымлівае загад не аказваць супраціўлення Чырвонай арміі. У памяшканні ўправы пагранічнай варты размяшчаецца ўправа НКУС СССР. Турму закрываюць.

Бацьку Казіміра арыштоўваюць, і доўгі час яго лёс невядомы. Сям'ю высяляюць у невялікі дом. У кватэры Вайцяхоўскіх селіцца сам начальнік управы НКУС. Марылю звальняюць з работы, бо польская мова цяпер не патрэбна. Казімір ідзе працаваць на лесапільны завод рабочым. Тэхнічны каледж, дзе вучыўся Аляксандр, часова закрылі, і Саша таксама пайшоў уладкоўвацца на лесапільны завод.

Неўзабаве ў адчыненую турму ўжо пад наглядам НКУС завозяць вязняў з Расіі. Прысылаюць з усходу і ахоўнікаў. Адзін з іх таемна распавядае Марылі Вайцяхоўскай, што яе мужа Тадэвуша расстралялі пад Смаленскам. Для ўсёй сям'і гэта навіна становіцца трагедыяй. Казімір вельмі любіў і паважаў бацьку. Ён быў галоўным аўтарытэтам для яго. Перад арыштам Тадэвуш даў сыну свой пісталет, каб ён схаваў яго, што Казік і зрабіў.

Падчас сустрэчы з сябрамі Казімір расказвае ім аб намеры забіць начальніка НКУС. Гэты чалавек, паводле меркавання хлопца, найбольш вінаваты ў горы яго сям'і. Ён арыштаваў бацьку, высяліў Вайцяхоўскіх з кватэры, дзе цяпер жыве сам, карыстаецца многімі іх рэчамі. Сябрук Мікалай падтрымлівае яго, а асцярожны Аляксандр хоча адгаварыць Казіміра ад гэтага небяспечнага кроку. Аднак Казімір вырашае здзейсніць замах.

У адзін з дзён ён чакае начальніка ўправы НКУС ля свайго былога дома. Як толькі той з'яўляецца, Казімір страляе ў яго і цяжка раніць. Збегчы не ўдалося. Ахова затрымлівае юнака. На допытах Казімір мусіць прызнацца, што аб яго намерах ведалі сябры Аляксандр і Мікалай. Іх таксама арыштоўваюць. На судзе Казіміра прыгаворваюць да смяротнага пакарання, а Мікалаю і Аляксандру даюць па 15 гадоў турмы. Марылю і Крысціну Вайцяхоўскіх адпраўляюць у ссылку на ўсход. Бацькі Аляксандра і Мікалая падсоўваюць хабар начальніку турмы, і Сашу з Колем пакідаюць адбываць пакаранне на гаспадарчых работах у Вілейскай турме.

Пацягнуліся доўгія дні зняволення. 22 чэрвеня 1941 года Германія нападае на СССР. Пачынаецца эвакуацыя вязняў турмы на ўсход. У першы канвой трапляюць Мікалай і Аляксандр. Праз нейкі час яны аказваюцца ў лагеры на Урале. Другі канвой вязняў турмы адышоў ад горада толькі 12 кіламетраў, як іх дагналі работнікі НКУС і давялі ахоўнікам загад аб расстрэле вязняў у сувязі з вельмі хуткім наступленнем немцаў. Што і было зроблена. Павінен быў быць і трэці канвой, але вязняў, што засталіся, расстралялі ў падвале турмы. Прычым трупы былі абезгалоўлены, целы закапаны на тэрыторыі турмы, а галовы – на гарадскіх могілках.

1942 год. Сталін і Чэрчыль дамовіліся аб фарміраванні Арміі Краёвай, якая ўвайшла ў склад брытанскай арміі Андэрса і была накіравана ў Паўночную Афрыку. Мікалай і Аляксандр трапляюць у польскія злучэнні і праз Афганістан, Іран, Сірыю дабіраюцца да Егіпта, дзе ўліваюцца ў склад англійскіх войск.

1943 год, ліпень. Станіслаў Грышкевіч, бацька Мікалая, працуе на чыгунцы. У яго абавязкі ўваходзіць абход пуцей з пагрозай, што калі ён не заўважыць падкладзеную партызанамі міну і цягнік узарвецца, то для яго гэта будзе немінучая смерць. У сувязі з вялікай колькасцю партызан у навакольных лясах абход Станіслаў звычайна рабіў з двума немцамі з палявой жандармерыі. Падчас аднаго з чарговых абходаў Станіслаў убачыў дрэнна замаскіраваную міну. Ён падазваў немцаў. Калі адзін з іх падышоў, адбыўся выбух. Партызаны, бачачы з бліжэйшага кустоўя, што міну знайшлі, вырашылі яе падарваць. У выніку выбуху Станіслаў і немец загінулі. Партызаны зніклі.

Вясна 1945 года. Мікалай і Аляксандр мужна ваююць з фашыстамі ў Паўночнай Італіі ў складзе англійскай арміі. Узнагароджаны медалямі. На жаль, Аляксандр ужо напрыканцы вайны быў цяжка паранены, і яго адправілі лячыцца ў шпіталь.

Вайна заканчваецца. Саша піша ліст дадому, што жывы, паранены і прыедзе пазней. Мікалай развітваецца з сябрам і накіроўваецца на радзіму. Як толькі ён з'явіўся ў родным горадзе, яго арыштоўваюць і зноў адпраўляюць у лагер. Такія людзі не патрэбны таталітарнаму рэжыму. Яны вельмі доўга былі на Захадзе, многае там убачылі. Пазней у бойцы з крымінальным элементам Мікалай гібне.

Бацька Аляксандра Міхаіл Завацкі, атрымаўшы ліст ад сына і ведаючы, што з ім будзе, паведамляе яму пра лёс Мікалая. Саша прыпыняе ўсялякую сувязь з радзімай і просіць начальніка шпіталя адправіць паштоўку на радзіму аб яго смерці.

З Афрыкі – у Лондан

Між тым Саша ў шпіталі знаёміцца с дзяўчынай Джэйн з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, на той час дамініёна Брытаніі. Яна таксама ваявала ў складзе англійскай арміі (медыкам) і была паранена. Паміж імі ўзнікаюць пачуцці, і ў далейшым яны заключаюць шлюб. Пасля выздараўлення маладая сям'я едзе жыць у Англію, у Лондан. Джэйн ідзе працаваць у бальніцу, а Аляксандр пасля дасканалага вывучэння англійскай мовы паступае ва ўніверсітэт і вучыцца на інжынера.

Між тым працягваецца жыццё і ў невялічкім гарадку, у якім нарадзіўся Саша. Яго сястра Ганна атрымлівае дыплом і становіцца выкладчыкам нямецкай мовы ў школе. Брат Мікалая Грышкевіча, Пятро, працуе на мэблевай фабрыцы столярам. Далей вучыцца Петрык не змог, бо бацька ў час вайны працаваў пад кіраўніцтвам немцаў, а брат – "вораг народа". Пятро і Ганна пакахалі адзін аднаго і стварылі сям'ю. У іх нарадзіліся два сыны, і іх назвалі Аляксандрам і Мікалаем. Яны пазней вывучыліся на інжынераў і працавалі на заводзе.

1984 год. Аляксандр уважліва сочыць за візітам Міхаіла Гарбачова ў Брытанію. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчар вельмі добра гаворыць аб кіраўніку СССР, верыць, што ў СССР ідзе дэмакратызацыя ўлады і грамадства.

Аляксандр піша першы за амаль 40 гадоў ліст на Радзіму. Завязваецца перапіска з сястрой Ганнай (бацькі і Пятро ўжо памерлі). Неўзабаве ён запрашае Ганну з пляменнікам пагасціць у яго ў Лондане.

1986 год. Ганна з сынам Сашам адпраўляюцца на цягніку ў Англію. Перад ад'ездам яны атрымалі жорсткі інструктаж з боку КДБ. Асабліва не сустракацца з журналістамі і не гаварыць нічога кепскага пра СССР. Так здарылася, што, ужо знаходзячыся на тэрыторыі адной з замежных краін, Ганна адбіла тэлеграму брату, але пераблытала дату, а таму, калі цягнік прыбыў у Лондан, на вакзале іх ніхто не сустрэў.

Ганне стала дрэнна, яна заплакала. Ні яна, ні сын не ведалі англійскай мовы і не маглі з кім-небудзь завесці гаворку. Гэта прыцягнула ўвагу навакольных. Знайшлі чалавека, які ведаў рускую мову. Ганна сказала, што прыехала на сустрэчу з братам, якога не бачыла 45 гадоў. Хутка дазваніліся да Аляксандра, і ён неўзабаве аказаўся на вакзале. Адбылася вельмі цёплая сустрэча. Незнаёмыя людзі пляскалі ў далоні.

Аляксандр быў ужо на пенсіі, жыў з жонкай Джэйн у прыгарадзе Лондана. Апошнія 12 гадоў перад пенсіяй ён працаваў начальнікам упраўлення падземных камунікацый графства.

Пляменнік Саша яшчэ аднойчы прыязджаў да дзядзькі ў госці. На жаль, праз некаторы час Аляксандр Завацкі памёр ад цяжкай хваробы, так і не наважыўшыся наведаць радзіму.

Уладзімір АЛЬФЕР.

P.S. Па пэўных прычынах прозвішчы некаторых герояў публікацыі зменены.

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ...

Где исполняются смертные приговоры?

Число смертных казней в мире за 2016 год упало на 37% по сравнению с 2015 годом, сообщает международная правозащитная организация Amnesty International.

В прошлом году были приведены в исполнение 1032 смертных приговора, тогда как годом ранее были казнены 1634 человека. Снижение числа казней произошло в первую очередь за счет Ирана и Пакистана.

При подсчетах не учитывались казни в Китае, так как точные данные по этой стране отсутствуют. Предполагается, что в КНР казнено больше людей, чем во всех остальных странах вместе взятых.

Впервые с 2006 года в список пяти стран с наибольшим числом казней не попали США. Сейчас странами с самым большим числом казней являются Китай, Иран (567), Саудовская Аравия (154), Ирак (88) и Пакистан (87).

В Европе и Центральной Азии смертная казнь действует только в двух странах: Беларуси и Казахстане.

Беларусь в апреле 2016 года привела в исполнение смертный приговор впервые за 17 месяцев. Год назад был казнен 22-летний житель Речицы Сергей Иванов, признанный виновным в изнасиловании и убийстве.

В настоящее время смертные казни отменены в 104 странах. Для сравнения: в 1997 году таких стран было только 64.

СЛЫШАЛИ?

Китай и Евросоюз намерены построить деревню на Луне



Китай вместе с Европейским космическим агентством (ESA) намерены совместно построить на Луне обитаемую базу.

Об уже ведущихся на эту тему переговорах первым сообщил китайским СМИ генеральный секретарь Китайского национального космического управления **Тян Юлун.**

Его европейские партнеры подтвердили эту информацию.

«Китайцы уже реализуют чрезвычайно амбициозную космическую программу», – заявил агентству Блумберг представитель ESA **Пол Хвистендаль.**

Генеральный директор ESA **Йоган-Дитрих Вёрнер** назвал «Лунную деревню», которую предлагается построить на спутнике Земли, потенциальной базой для будущих полетов к Марсу, а также шансом на развитие лунного туризма и даже первым шагом к возможной добыче полезных ископаемых на Луне.

СКАНДАЛ

Принц Уильям потребовал с таблоидов 1,6 миллиона долларов за фото жены



Британская королевская семья потребовала с двух французских таблоидов более полутора миллионов евро компенсации из-за публикации фото, на которых жена принца Уильяма Кейт запечатлена топлес.

Об этом во время рассмотрения иска о нарушении права на частную жизнь во Франции рассказал адвокат ответчиков.

Французский таблоид Closer и газета La Provence в сентябре 2012 года опубликовали снимки, на которых герцогиня Кембриджская снята с обнаженной грудью у плавательного бассейна. Фотографии были сделаны во время отдыха герцога и герцогини Кембриджских в замке во Франции в гостях у двоюродного дяди Уильяма лорда Линли.

Публикации вызвали массовое возмущение в Британии, британские СМИ принципиально отказались их публиковать.

Королевская семья также была разгневана публикацией снимков и инициировала судебное разбирательство.

По обвинению в нарушении права на личную жизнь перед французским судом предстали шесть человек, причастных к публикации снимков, среди которых редактор Closer, издатель La Provence и фотографы.

НУ И НУ!

Самая тяжелая женщина в мире сбросила 250 кг после операции

Египтянке Эман Абд эль-Ати, еще недавно весившей 500 килограммов, в индийской клинике провели сложную операцию, в результате которой она потеряла половину своего веса.

В заявлении хирурга Муззафала Лакдавалы говорится, что пациентка продолжает терять вес. В течение следующих шести месяцев Эман Абд эль-Ати будет принимать специальные препараты для лечения ожирения. Родственники женщины рассказали, что при рождении она весила пять килограммов, ей был поставлен диагноз «элефантиаз», или «слоновья болезнь». При этой болезни сильно увеличиваются конечности за счет болезненного разрастания кожи и подкожной клетчатки.

В 11 лет вес девочки стал стремительно расти, и она перенесла инсульт, который приковал ее к кровати. Сейчас о женщине заботятся ее мать и сестра. Родственники египтянки говорят, что из-за своего веса Эман не выходила из дома целых 25 лет.

НА СВЯЗИ – ГЕРМАНИЯ

Меркель примет решительные меры против дезинформации



Канцлер ФРГ Ангела Меркель не боится возможного российского вмешательства в ход выборов в германский бундестаг. Об этом она заявила на совместной пресс-конференции с президентом РФ Владимиром Путиным в Сочи. «Я не из пугливых, – ответила она на вопрос о вероятности подобного сценария. – И с уверенностью исхожу из того, что мы сможем без проблем провести предвыборную кампанию между нами, немцами».

Меркель подчеркнула, что в случае дезинформации придется принять решительные меры. Гибридная война, одним из методов которой является дезинформация, является частью военной доктрины России, указала глава германского правительства.

Диктатор с демократическим уклоном

19 апреля 2017 года исполнилось 50 лет со дня смерти первого федерального канцлера Германии **Конрада Аденауэра.**

Его заслуга в том, что он был готов в 1945 году, в трудный период немецкой истории, взять на себя ответственность, несмотря на то, что по возрасту мог уйти на заслуженный отдых. На момент вступления в 1949 году в должность канцлера Германии Конраду Аденауэру было 73 года, в отставку он ушел в 87 лет, пробыв у власти в общей сложности 14 лет.

Он был тем, кто привел немцев к демократии, которая является сегодня основой политической системы страны. Он также способствовал сближению с Израилем и примирению с Францией.

МУДРЫЕ МЫСЛИ



Конрад Аденауэр был остроумным человеком, автором ярких высказываний. Его часто цитируют и сейчас. Вот несколько таких его выражений.

** Все человеческие органы рано или поздно устают, но только не язык.*

** Все под одним небом живем, но горизонт у всех разный.*

** Я диктатор, но с сильным демократическим уклоном.*

** Если у двух человек мнения всегда совпадают, оба они ни к чему не годны.*

** Даже шаг назад – иногда шаг к цели.*

Бундестаг одобрил частичный запрет на ношение никабов

Бундестаг одобрил законопроект, запрещающий работникам госструктур ношение в рабочее время одежды, полностью закрывающей лицо, – никаба или паранджи.

Мера касается госслужащих, судей и военных.

Поют в хоре, играют в оркестрах...



Овладеть искусством игры хотя бы на одном музыкальном инструменте, научиться прилично петь и, может быть, даже самостоятельно сочинять музыку – кто не мечтал когда-то об этом! И жители Германии, страны богатых музыкальных традиций, тут, конечно, не исключение. Наоборот, наблюдается настоящий музыкальный бум.

По последним данным, более трех миллионов немцев серьезно увлекаются музыкой: регулярно поют в хоре, играют в оркестрах и инструментальных ансамблях, а также музицируют вместе.

А в общей сложности число музыкантов-любителей, среди которых не только те, кто выступает перед публикой, но и те, кто играет в свободное время просто для себя и своих близких, составляет в Германии, стране с 80-миллионным населением, по меньшей мере 14 миллионов человек.

Парад новаторов и провокаторов

Традиционными народными гуляниями с насыщенной культурной программой открылся в немецком городе Реклингхаузене 71-й Международный Рурский театральный фестиваль – один из крупнейших театральных смотров не только в Германии, но и во всей Европе.

Известные и малоизвестные, но многообещающие режиссеры со всего мира показывают здесь свои спектакли.

Фестиваль продлится до 18 июня.



РЕДКИЙ СЛУЧАЙ

Муж и жена в Иллинойсе умерли друг за другом в течение часа



Исаак и Тереза Ваткин из американского штата Иллинойс умерли практически одновременно, в течение одного часа, и до последнего вздоха держались за руки. Они прожили вместе 69 лет.

Исааку Ваткину был 91 год, его жене Терезе – 89.

«Их любовь друг к другу была настолько велика, что они не смогли жить друг без друга», – сказала их дочь Клара Гесклин на семейной церемонии прощания с умершими родителями.

ИХ НРАВЫ

Ле Пен освистали и закидали яйцами

Кандидата в президенты Франции от партии «Национальный фронт» Марин Ле Пен во время поездки в Бретань 4 мая освистали и закидали яйцами. Инцидент попал на видео.

Противники Ле Пен в Бретани во время яичной атаки выкрикивали лозунги «Долой фашистов!» и «Вам нечего здесь делать, мадам!», сообщает BFM TV.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

У кнігі 160 спонсараў

11 мая адбудзецца прэзентацыя кнігі ўспамінаў беларускага андэрсаўца з-пад Кобрына Паўла Нічыпарука – "Адысея палешука".

У гісторыка Ігара Мельнікава атрымалася! Ён сабраў грошы на выданне ўнікальных успамінаў жаўнера Другога польскага корпусу Паўла Нічыпарука. Збор сродкаў доўжыўся 45 дзён на краўдфандынгавай пляцоўцы ulej.by, і былі моманты, калі Мельнікаву здавалася, што нічога з яго ідэі не атрымаецца.

– *Усё ж такі ў краіне крызіс,* – кажа гісторык. – *І будзе няпраўда, калі скажу, што ўсе адразу падхапілі маю ініцыятыву і невялікая сума ў 8000 рублёў, неабходных для выдання кнігі, была хуценька сабрана. Але ж праўда і тое, што праектам зацікавіліся шматлікія жыхары не толькі Беларусі. Адгукнуліся людзі з Крыма, якія шануюць Украіну і Беларусь, прыйшлі пераводы са Швецыі, дзе проста зацікавіліся бітвай пад Монтэ-Касіна, з Расіі, дзе неабыякавыя людзі імкнуліся дапамагчы выданню ўспамінаў ветэрана, які змагаўся з нацыстамі, няхай і не ў савецкім войску. Беларусы з Італіі дапамаглі – яны па сёння памятаюць подзвіг суайчыннікаў падчас Другой сусветнай. Такім чынам праект стаў паспяховым, і ў "Адысеі палешука" больш за 160 спонсараў.*

Як раней пісала "Народная Воля", жыццё палешука Паўла Нічыпарука – ілюстрацыя таго, праз якія цяжкія выпрабаванні давялося прайсці жыхарам Беларусі падчас Другой сусветнай вайны і пасля яе. Павел Нічыпарук нарадзіўся ў 1902 г. пад Кобрынам. У лютым 1941 г. яго арыштавалі і накіравалі ў лагер, што ў Свярдлоўскай вобласці. У 1942 г. беларус аказаўся ў Арміі Андэрса і ў яе складзе ўдзельнічаў у баях з нацыстамі ў Італіі. У 1948 г. Нічыпарук паехаў у ЗША, дзе і пражыў да самай смерці – да 1979 года.



Цікавым фактам з'яўляецца тое, што ў 1989 годзе з рукапісам успамінаў Нічыпарука азнаёміўся Васіль Быкаў і параіў перадаць яго ў выдавецтва "Беларусь". Аднак тады мемуары беларуса так і не ўбачылі свет. Доўгія дзесяцігоддзі яны ляжалі і чакалі свайго даследчыка, а потым трапілі ў рукі гісторыка Ігара Мельнікава. "*Па-першае, я пераклаў успаміны на беларускую мову, бо Павел Нічыпарук быў не вельмі адукаваны чалавек, пісаў на беларуска-польска-рускай трасянцы,* – кажа Ігар Мельнікаў. – *Да таго ж увесь расповед суправаджаецца маімі гістарычнымі каментарыямі, шматлікімі фатаграфіямі, якіх у кнізе паўтары сотні. Я імкнуўся зрабіць тэкст такім, каб ён быў цікавы і зразумелы не толькі людзям сталага веку ці адмыслоўцам, але каб і сучасніку было зразумела, праз якія пакуты прыйшлося прайсці беларусам*".

Марыя ЭЙСМАНТ.

Прэзентацыя кнігі "Адысея палешука" адбудзецца 11 мая 2017 года ў 19.00 у Галерэі TUT.BY (г.Мінск, пр-т Дзяржынскага, 57).

ФАКТ

Россия списала Киргизии долг на 240 миллионов долларов

Премьер-министр РФ Дмитрий Медведев одобрил списание Москвой 100 процентов долга Бишкека. В конце марта эта сумма составляла 240 млн долларов.

В 2016 году Россия списала Киргизии долги на сумму 30 млн долларов. В целом за последние 11 лет размер списанных Москвой долгов Киргизии превысил 703 млн долларов.

ПОЗИЦИЯ

Меркель против нового договора по урегулированию конфликта в Украине

Меркель провела переговоры с Путиным в Сочи. По окончании диалога она заявила, что новый договор по Украине вместо Минских договоренностей не имеет смысла. Об этом она заявила на совместной пресс-конференции с российским президентом Владимиром Путиным в Сочи. «В минских договоренностях уже есть все, – сказала Меркель. – Проблема в их соблюдении, а не в самом договоре».

По ее мнению, Украина прежде всего должна получить доступ к собственной границе, а затем должны быть достигнуты «болезненные компромиссы» относительно выборов в самопровозглашенных республиках Донбасса. Глава германского правительства указала на то, что без выборов и введения легитимной власти в «ДНР» и «ЛНР» не могут проводиться прямые переговоры с представителями этих регионов, как на этом настаивает президент Путин и российская сторона.

КИЕВ

Судебный процесс по делу Виктора Януковича перенесен на 18 мая

В Оболонском районном суде Киева начался заочный процесс над экс-президентом Украины Виктором Януковичем. И тут же был перенесен на 18 мая. Отстраненному от власти после Евромайдана в феврале 2014 года и бежавшему в Россию Януковичу инкриминируют государственную измену, посягательство на территориальную целостность и суверенитет Украины, а также пособничество российской агрессии.

14 марта Военная прокуратура Украины передала в суд обвинительный акт в отношении Януковича. Среди ключевых доказательств вины экс-президента фигурирует фотокопия его письма, адресованного три года назад президенту России Владимиру Путину, с просьбой ввести на территорию Украины российские войска. Этот документ демонстрировал 4 марта 2014 года на заседании Совета безопасности ООН ныне покойный представитель России в ООН Виталий Чуркин.

«Этот процесс не только о гражданине Януковиче. Этот процесс также о его кремлевских хозяевах, которые использовали, как фиговый листок, подписанный Януковичем документ для того, чтобы оккупировать украинский Крым, залить кровью украинский Донбасс, попытаться поставить на колени нашу страну», – подчеркнул Генеральный прокурор Украины Юрий Луценко. По его словам, действия бывшего главы государства привели «к оккупации Россией Крыма и нанесению убытков Украине вследствие потери объектов государственной собственности на общую сумму свыше одного триллиона гривен (около 40 миллиардов долларов).

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Як Эдуард Занкавец асвойваў «цаліну» ў Казахстане

Беларускі трэнер распавёў "Народнай Волі" пра жыццё і працу ў Астане, а таксама пра тое, чаму вярнуўся ў Мінск.



Днямі стала вядома: беларускі настаўнік "Барыса" з Астаны і зборнай Казахстана па хакеі **Эдуард ЗАНКАВЕЦ** пакідае абедзве пасады, кантракт працягнуты не будзе.

Дарэчы, пад кіраўніцтвам беларускага спецыяліста "Барыс" выйшаў у плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі і нават прайшоў у першым раўндзе чалябінскі "Трактар". Цудоўны вынік, і можна было б працягваць работу, але…

"Я хацеў бы падзякаваць ігракам, балельшчыкам, кіраўніцтву за тое, што мы працавалі разам, – цытуюць казахстанскія СМІ словы Эдуарда Занкаўца. – *Маё падарожжа ў Казахстан завяршылася. Кантракт з "Барысам" закончыўся, і працягваць яго я не буду. Буду балець і перажываць за казахстанскі хакей…"*

– Да верасня мінулага года вы працавалі скаўтам амерыканскага хакейнага клуба "Чыкага Блэкхокс", і раптам лёс закінуў вас у Казахстан. Як так здарылася?

– Шчыра кажучы, прапанова паспрабаваць свае сілы на новай працы была даволі нечаканай. І рашэнне трэба было прымаць дастаткова хутка. Пасля таго як зборная Казахстана не трапіла на Алімпіяду, паўстала пытанне аб змене трэнерскага штаба, і мне прапанавалі гэты варыянт. Вызначыцца трэба было на працягу сутак, і я гэты выклік прыняў. Адапрвіўся асвойваць "цаліну". Узначаліў і "Барыс", і нацыянальную каманду.

– Што стала вырашальным пры прыняцці рашэння?

– У "Барыса" добрая інфраструктура, там шмат сваіх ігракоў. Таму было цікава працаваць з базавым клубам нацыянальнай каманды і адначасова са зборнай. Гэта быў амбіцыёзны праект і, як я ўжо казаў, сур'ёзны выклік. Такія прапановы нячаста сустракаюцца, таму грэх было не выкарыстаць шанц.

– Як сустрэў Казахстан?

– Усё было проста цудоўна! Той накірунак, што я прапанаваў, прыйшоўся ўсім даспадобы, таму працавалася добра. У бытавым плане таксама не было ніякіх нязручнасцяў – службовая кватэра, машына…

– Фінансавы складнік меў для вас вялікае значэнне?

– Для мяне гэта было не прыярытэтнае пытанне, але магу сказаць, што ў параўнанні з папярэдняй працай я нічога не згубіў. У КХЛ у галоўных трэнераў заробкі даволі прыстойныя.

– Краіна не стала для вас "цёмным конікам"?

– Абсалютна не, бо падчас працы ў Кантынентальнай хакейнай лізе мы кожны год прыязджалі ў сталіцу Казахстана. Праўда, у гэтым годзе давялося працаваць ужо на новай арэне. Астана – малады горад, але досыць прыгожы. Сучасныя будынкі, шырокія вуліцы…

– Можаце параўнаць узровень жыцця ў той жа Астане і ў Мінску?

– Думаю, што ён прыкладна аднолькавы. Дакладна не ведаю, колькі атрымліваюць казахі, але цэны ў магазінах падобныя да мінскіх.

– А калі параўноўваць узровень казахстанскага і беларускага хакея?..

– Унутраныя чэмпіянаты таксама моцна не адрозніваюцца, хаця чатыры лепшыя беларускія каманды ўсё-такі будуць больш моцныя за чацвёрку лепшых клубаў казахстанскага першынства. Што тычыцца агульнай структуры, то ў Казахстане ёсць яшчэ два клубы, якія выступаюць у расійскай Вышэйшай лізе.

Я не ведаю, як дакладна аказваецца там дзяржаўная падтрымка хакею, але ў абласцях такая падтрымка з боку кіраўніцтва адчуваецца.

– У Беларусі апошнім часам быў самы сапраўдны бум будаўніцтва лядовых палацаў. Што ў гэтым плане чуваць у казахаў?

– Як ужо казаў, зараз для "Барыса" пабудавалі адну з лепшых арэн у КХЛ. Што тычыцца іншых гарадоў, то невялічкія лядовыя палацы там таксама ёсць, хаця не бяруся параўноўваць маштабы будаўніцтва.

Дарэчы, на пачатку чэмпіянату сярэдняя наведвальнасць матчаў з удзелам "Барыса" была 4–4,5 тысячы гледачоў, а калі завяршалі сезон, "Барыс-Арэна" была, як кажуць, пад завязку. Больш за 11 тысяч балельшчыкаў прыходзілі падтрымаць каманду.

– Эдуард, а ці былі ў вас у Казахстане свае крытыкі?

– Справа ў тым, што я звычайна не звяртаю ўвагі на людзей, якія крытыкуюць на розных форумах альбо ў сацыяльных сетках. У мяне ёсць кіраўніцтва, да крытыкі якога і прыслухоўваюся. Таму, безумоўна, былі некаторыя матчы, калі даводзілася з кіраўнікамі клуба абмяркоўваць якасць гульні, але ж усё гэта – працоўныя моманты.

Увогуле, выхад каманды ў плэй-оф і перамога ў першым раўндзе – гэта быў, напэўна, максімальны вынік, якога на гэты момант можна было дасягнуць.

– Хакеістаў і трэнераў, напэўна, пасля такога поспеху чакалі прэміяльныя?

– Усе бонусы зараней прапісаны ў кантрактах, таму, безумоўна, яны будуць.

– У "Барыса" сур'ёзныя спонсары?

– У Казахстане ёсць арганізацыя накшталт беларускага Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, якая і выдаткоўвае грошы на асноўныя спартыўныя каманды краіны. Гэта асноўны спонсар, хаця, напэўна ж, аказваюць дапамогу і некаторыя прадпрыемствы альбо кампаніі.

– Ці быў у вас вольны час, каб можна было паездзіць па краіне, даведацца пра яе больш?

– Шчыра кажучы, асноўны час забіраў хакей, таму калі і быў вольны час, то толькі ў Астане.

– Вы жылі там з сям'ёй?

– Так, але ў гэтым годзе дачка пойдзе ў першы клас, а гэта, як мне падаецца, вельмі сур'ёзны перыяд жыцця і для бацькоў. Сям'я ў мяне на першым месцы. Таму кантракт не працягваў, вярнуліся ў Мінск.

– У бліжэйшы час чым будзеце займацца? Адпачываць ад хакея?

– У маі зaймуся аднаўленнем сіл, летам збіраемся з'ездзіць на адпачынак у Італію. А далей – час пакажа.

– І напрыканцы – пра надзённае. Сёння зборная Беларусі стартуе на чэмпіянаце свету па хакеі. Ваш прагноз: на што можам разлічваць?

– Папраўдзе, не бачыў гульні нашай каманды ў гэтым годзе, але, мяркую, наўрад ці сёлетняе выступленне беларусаў будзе моцна адрозніваццa ад папярэдніх. І вынік можа быць самы розны – ад аптымістычнага, калі зборная трапіць у васьмёрку мацнейшых, да песімістычнага, калі давядзецца змагацца за права застацца ў эліце. Справа ў тым, што зараз у свеце ёсць шэсць мацнейшых каманд, а астатнія прыкладна аднаго ўзроўню. Вось і паглядзім, хто і як падрыхтаваўся.

Алесь СІВЫ.

ДАРЭЧЫ

5 мая ***зборная Беларусі*** *правядзе першы матч чэмпіянату свету ў* ***групе В*** *супраць каманды Фінляндыі (17.15). Далей беларуская каманда згуляе 6 мая з Чэхіяй (17.15), 8 мая – з Канадай (17.15), 10 мая – са Швейцарыяй (17.15), 12 мая – з Францыяй (21.15), 13 мая сустрэнецца са Славеніяй (17.15), а завершыць выступленне ў групавой стадыі 16 мая з Нарвегіяй (13.15).*

Група А *(Швецыя, Расія, ЗША, Германія, Латвія, Данія, Славакія, Італія) згуляе ў Кёльне.*

Чатыры лепшыя каманды з кожнай групы выйдуць у чвэрцьфінал першынства.

ЗАПРАШЭННЕ

«Цюльпаны» Эндру Мікшыса

9 мая ў Галерэі сучаснага мастацтва "Ў" – адкрыццё выставы амерыканска-літоўскага фатографа Эндру Мікшыса.



Ён упершыню наведаў Беларусь у 2009 годзе падчас святкавання Дня Перамогі. Адметна аздобленая сталіца і афіцыйныя святкаванні з парадам і дэманстрацыяй вайсковай тэхнікі і трактароў нагадалі мастаку іканаграфію маштабных відовішчаў савецкіх часоў. І куды ні кінеш вокам – паўсюль красавалі чырвоныя цюльпаны. Іх колер і сімволіка хутка сталі тэмай для новага праекта Эндру Мікшыса.

Фатограф зноў і зноў вяртаўся на Беларусь, папаўняючы сваю калекцыю здымкамі іншых дзяржаўных святаў. На ўскраінах афіцыйнай культуры ён шукаў асабістыя, прыватныя гісторыі, якія існуюць нібыта па-за ідэалогіяй. Менавіта таму пісьменнік **Лайманас Брыедзіс** слушна заўважыў: *"Фатаграфіі Мікшыса – гэта не столькі рэпартаж пра Беларусь у колеры ці архіў афіцыёзных забаў. Гэта дыярама адзіноты свята".*

Для сваёй першай выставы ў Беларусі Эндру Мікшыс створыць інсталяцыю фатаграфій і відэа, зробленых па выніках сваіх вандровак на працягу пяці гадоў. Неад'емнай самастойнай часткай праекта з'яўляецца кніга мастака пад такой жа назвай – "Цюльпаны". У 2016 годзе "Цюльпаны" былі вылучаны куратарам фатаграфіі TATE Modern у Лондане Сайманам Бэйкерам сярод дзесяці найлепшых фотаальбомаў года.

Эндру Мікшыс нарадзіўся і вырас у Амерыцы. Яго бацька і дзядуля імігрыравалі з Літвы ў ЗША пасля Другой сусветнай, а маці – амерыканка з украінскімі і італьянскімі каранямі. Фатаграфіі Мікшыса дэманстраваліся на самых прэстыжных міжнародных выставах. Зараз Эндру Мікшыс жыве на два гарады, у Сіетле і Вільнюсе. У Вільнюсе мае сваё ўласнае выдавецтва ARÖK Books.

Адкрыццё выставы ў 19.00.

Марына КОКТЫШ.

СВЯТА

Шэсце, салют, 3D-шоу

Як пройдзе ў Мінску святкаванне Дня Перамогі, расказала першы намеснік міністра культуры Беларусі ***Ірына Дрыга.***

Раніцай 9 Мая на праспекце Незалежнасці, на прылеглых да яго вуліцах, на плошчы Перамогі пройдзе шэсце памяці «Беларусь памятае» з удзелам грамадскасці Мінска, прадстаўнікоў маладзёжных і дзіцячых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў. Яны пройдуць да плошчы Перамогі, несучы ў руках партрэты герояў вайны, сваіх сваякоў як сведчанне памяці пра вайну і ўсенароднай удзячнасці пакаленню пераможцаў.

Для ветэранаў на плошчы Перамогі будуць устаноўлены трыбуны, дзе яны сустрэнуць шэсце. Затым да помніка на плошчы Перамогі будуць ускладзены кветкі, завершыцца цырымонія масавым выкананнем песні "Дзень Перамогі". Вечарам пройдзе канцэрт тэлепраекта "Плошча Перамогі – 2017". *"У канцэртнай праграме – тэатралізаванае музычнае прадстаўленне і тэматычнае 3D-шоу, якое пройдзе ўпершыню ў Мінску на двух будынках ззаду манумента Перамогі ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь"*, – адзначыла першы намеснік міністра культуры. А завершыцца святкаванне 30 залпамі салюту.

НА ТВОРЧАЙ ХВАЛІ

Лета Алеся Камоцкага

З Алесем Камоцкім мы дамовіліся сустрэцца на вуліцы. Пазнала яго здалёк, і першае, пра што падумала: чаму творчых людзей так лёгка заўважыць у натоўпе?

Камоцкі тлумачыць: "Проста творчыя людзі натоўпам не ходзяць. Яны яго пазбягаюць. А тое, што выдзяляюцца, – то тут знешнасць не галоўнае. Галоўнае – як яе несці".

Так пачынаецца наша размова пра жыццё з яго музыкай і паэзіяй. Гаворым пераважна пра творчасць слоўную. Бо што б там ні казалі і як бы ўпарта Алеся Камоцкага ні называлі бардам, спачатку ён – паэт. Гэта па-першае. Па-другое, зусім хутка выйдзе яго новы паэтычны зборнік пад назвай "Забірай маё лета".



– Алесь, два гады вы нічога не выдавалі. Не зусім характэрная для вас паўза…

– Выдаваць не расхацелася. Проста не хочацца спяшацца. Кніжка мусіла выйсці яшчэ ў 2014 годзе, але перыядычна ўзнікалі розныя спрэчкі. Напрыклад, наконт памеру. Нарэшце прыйшлі да таго, што будзем рабіць кніжную мініяцюру. Каб у кішэню прасцей было пакласці. Неаднаразова змянялася і назва. Былі варыянты ад "Неяк так" да канчатковага "Забірай маё лета". Аздобілі ўсё традыцыйна фотаздымкамі. Іх зрабіў Вадзім Грудзько. Думаю, што хутка гэта кніжка выйдзе.

– Назва кніжкі даволі лірычная. А змест?

– Там сабрана шмат рознага, ад маленькіх вершаў да вялікага перакладу "Прогласа да Евангелля" Канстанціна Філосафа. Ёсць, дарэчы, і пераклады песень, напрыклад – "Besame mucho" Кансуэлы Веласкес.

Раніца, смак пацалунка –
Помніш, як гэта калісьці было ўпершыню?
Хочацца заўтра прачнуцца
І, як учора, у вочы табе зазірнуць.

Памяць і мроя паціху яднаюцца,
Мары знаходзяць спакой,
Новыя дні як заўжды пачынаюцца,
Але ўжо не з табой.

Гэтыя восем радкоў я пісаў два месяцы. А вось пачыналася кніжка з верша, які ўзнік, як кажуць, на адным дыханні. Ехаў у электрычцы з Маладзечна ў Мінск…

На вуліцы быў панядзелак,
Душа ж вымагала суботы,
А дні мітусні не хацелі,
Марудна ішлі, неахвотна.

Было у жыцці няутульна
Ад вечара, ночы і лета,
Пад раніцу думкі заснулі,
Аўторак прыйшоў непрыкметна.

Жыццё не па-роўнаму дзеліць –
То густа, то пуста, то смешна.
І што ў ім рабіў панядзелак?
Напэўна, усё перамешваў.

– Іосіф Бродскі неяк сказаў, што людзей, якія могуць адчуць усю прыгажосць паэзіі, адзін працэнт ад агульнай колькасці жыхароў на Зямлі. Згодны з такой арыфметыкай?

– Не да канца. Людзі па сваёй сутнасці вельмі паэтычныя істоты, але большасць з іх пра гэта нават не здагадваецца. Сёння адзінкі звяртаюць увагу на такія рэчы, як паэзія. Таму што ў нас спачатку вучаць дзяліць і множыць, і толькі потым – думаць, разважаць і адчуваць. Я перакананы, што ў выхаванні чалавека літаратура павінна займаць не ўмоўна, а напраўду першае месца.

– Вы нарадзіліся і адбыліся ў краіне, якой даўна няма на сусветнай мапе. Час быў спрэчны, але, магчыма, не самы горшы?

– Мне здаецца, што раней больш смела разважалі пра тое, што будзе. Цяпер у нас агульная няўпэўненасць наконт заўтрашняга дня і дзікае неразуменне ўчарашняга. Нешта сёння зламалася і ў нашых стасунках. Раней людзі былі ўсё ж такі больш чалавечнымі...

– Апошнім часам сярод вашых калег стала набіраць папулярнасць такая з'ява, як краўдфандынг. А ці магчыма, што Алесь Камоцкі таксама неўзабаве кіне кліч у інтэрнэце на збор сродкаў для запісу новага альбома?

– Мне элементарна не ўдасца арганізаваць такі працэс. Я пра гэта думаў яшчэ гадоў дваццаць таму, а пасля вырашыў, што ніхто мне нічога проста так не дасць, пазычыў грошы і выдаў свой першы альбом. А расказваць усім, які я бедны, гаротны і няшчасны… Навошта? Тым больш што некаторыя з тых людзей, якія гэтым займаюцца, могуць абсалютна спакойна заплаціць за ўсё з уласнай кішэні. Тут не столькі грошы патрэбны, колькі развіццё гэтай новай культуры самарэкламы праз прыгожае пабіральніцтва.

– Чаму апошнім часам вы сталі радзей рабіць сольныя канцэрты?

– Занудзіла выступаць у звыклым фармаце. Хочацца рабіць усё па-другому, але пакуль што няма разумення як. Апошнім часам захапіўся ірландскай музыкай. Праўда, я не выконваю балады ў аўтэнтычным выглядзе. Перакладаю, штосьці змяняю, магчыма, псую, але такім чынам раблю іх пад сябе. Атрымліваецца трошкі больш, чым проста прыгожая музыка і цікавыя словы. Там вельмі многа падтэкстаў, падсэнсаў. Трэба падрыхтаваць публіку да адчування новых нюансаў. Па-іншаму пакуль што не надта хочацца. А проста адыграць яшчэ адзін канцэрт, каб засвяціцца на публіцы? Мусіць, не варта…

– Як вам здаецца, талент – капрызная з'ява?

